Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

10 год выданьня

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял пасылаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вярочаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.
Зьмена адрэсу: іншагародняя	— 20 к.
мясцовая	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок шапаралі пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок шапаралі пасьперад тэксту	1 р. — к.
За радок шапаралі перад тэкстам	1 р. 50 к.

Сьмешныя на 50 проц. даражэй.

Зьмы тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумант	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Беспрацоўн. і чырвонаармейцам за дакумант	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-й дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА

№ 260 (2749) Субота, 16-га лістапада 1929 г.

Аб скліканьні 2 Сэсіі Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР IX скліканьня.

2-я Сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР IX-га скліканьня склікаецца 20-га лістапада 1929 г. У гор. Менску.

ПАРАДАК ДНЮ НАСТУПНЫ:

1. Кантрольныя лічбы на 1929-30 год.
2. Дзяржаўны бюджэт 1929-30 году:
   а) Даклад СНК БССР;
   б) Садаклад Бюджэтнай камісіі ЦВК БССР,
   в) Выкананьне бюджэту за 1927-28 год.
3. Аб калектывізацыі сельскай гаспадаркі.
4. Аб чыстцы савецкага апарату.
5. Інфармацыя аб рэарганізацыі Віцебскай акругі ў вопытна-паказальную.
6. Інфармацыя аб усебеларускай сельска-гаспадарчай выстаўцы.
7. Аб утварэньні Народнага Камісарыяту Земляробства Саюзу ССР.
8. Зацьверджаньне важнейшых пастаноў, прынятых у пэрыяд паміж сэсіямі ЦВК.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ХАЦКЕВІЧ.

ЖАДАЕМ ПОСЬПЕХАЎ.

Сёньня адчыняецца ўнечарговы V зьезд працаўнікоў друку БССР. Значэньне гэтага зьезду надзвычайна вялікае для ўсяе масы працаўнікоў друку і для ўсяго палітычнага жыцьця нашай краіны. Зьезд зьбіраецца ў пэрыяд абвостранай клясавай барацьбы ў горадзе і вёсцы, зьезд зьбіраецца ў час разгорнутага наступу на капіталістычныя элемэнты, зьезд зьбіраецца ў час контрэволюцыйных вылазак нацыянал-дэмакратаў, у час калі правыя апартуністы ўсялякімі спосабамі стараюцца ўставіць палкі ў шпіцы пасьпяховага бегу сацыялістычнага будаўніцтва, у час ня спыняючыхся левых наскокаў на гэнэральную лінію камуністычнай партыі.

Зьезд павінен будзе паказаць свой палітычны твар да гэтых падзей, зьезд павінен будзе рашуча адкінуць прымірэнчыя—апартуністычныя паводзіны мінулага складу Беларускага бюро сэкцыі працаўнікоў друку.

Апроч гэтага пытаньня, зьезд падойдзе да вырашэньня практычных сваіх задач. Зьезд заслухае і абгаворыць задачы друку, зьезд заслухае справаздачу цэнтральнага бюро сэкцыі працаўнікоў друку, зьезд абгаворыць асноўныя паказальнікі пяцігодкі друку. Зьезд надалей павінен будзе абраць працаздольнае бюро, якое змаглобы справіцца з практычным вырашэньнем тых пытаньняў, якія намеціць зьезд, якія стаяць перад прафарганізацыямі працаўнікоў друку.

Перад нашым савецкім і партыйным друкам стаяць вялічэзныя задачы. Разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва, індустрыялізацыя краіны, сацыялістычная перабудова вёскі, пераход на непрарыўны рабочы тыдзень, змігадзінны рабочы дзень у прамысловасьці, барацьба з усялякімі ўхіламі ад ленінскага кіраўніцтва камуністычнай партыі барацьба з яўнымі контрэвалюцыйнымі выступленьнямі нацыянал-дэмакратаў. Гэтыя задачы партыі і пралетарыяту зьяўляюцца і першачарговымі задачамі друку.

Як і ва ўсёй нашай рабоце друк павінен ужываць мэтад пралетарскай самакрытыкі, асабліва накіроўваючы апошнюю на тыя вучасткі нашае работы, дзе пагражае найбольшая небясьпека. Самакрытыка павінна заняць ня толькі цэнтральнае месца ў друку, але і цэнтральнае месца ў рабоце прафарганізацыі працаўнікоў друку.

У наш час друк адыгрывае вялікую ролю ў сацыялістычным будаўніцтве ў клясавай барацьбе. Нам трэба дабіцца таго, каб друк быў магутным выявіцелем волі пралетарыяту, волі камуністычнай партыі. На гэтым вучастку мы мелі значныя, а дзе ні дзе і вялікія промахі. Значная доля гэтых промахаў падае на тое, што цэлы шэраг працаўнікоў друку былі не прыстасаваны да новых задач і нават болей таго, шэраг працаўнікоў друку ня мелі пралетарскіх, камуністычных поглядаў на стан нашай рэчаіснасьці.

Зьезд, абіраючы новае бюро павінен даць наказ яму, каб апошняе больш увагі вылучыла падрыхтоўцы кадраў, каб апошняе разбурыла дзе ні дзе яшчэ маючыеся думкі аб журналісцкай касце. У шэрагі працаўнікоў друку трэба ўцягнуць новых працаўнікоў з рабочых, з ліку рабкораў. Наш друк, як і па зьместу сваёй работы, так і па сваіх работніках павінен быць апралетарызаваны.

Толькі ў гэтым выпадку друк здолее выканаць тыя задачы, якія перад ім стаяць у наш час.

Спадзяемся, што зьезд правільна, па пралетарску вырашыць тыя задачы, якія перад ім стаяць, што зьезд абярэ бальшавіцкіх выканаўцаў сваіх і партыйных пастаноў, што зьезд абярэ працаздольнае бюро.

Пажадаем лепшых посьпехаў у працы зьезду. Шлём шчырае прывітаньне прадстаўнікам пралетарскага друку.

Акруговая канфэрэнцыя груп беднаты.

Учора ўвечары ў залі пасяджэньняў Менскага АВК адчынілася III канфэрэнцыя груп беднаты Менскай акругі. На канфэрэнцыю прыбыла з месц 157 дэлегатаў. Канфэрэнцыя мае абмеркаваць наступныя пытаньні: пяцігадовы план разьвіцьця народнае гаспадаркі Саюзу і БССР з канкрэтным вызначэньнем задач для мясцовых арганізацый і ўстаноў, удзел беднаты ў перавыбарах сельскіх саветаў і камітэтаў сялянскіх т-ваў узаемадапамогі, вынікі работы па рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і далейшыя задачы.

Перад пачаткам дзелавой работы канфэрэнцыю прывіталі прадстаўнікі партыйных, рабочых і вайсковых арганізацый: ад Менскага акругкому КП(б)Б т. **Славінскі**, ад рабочых заводу «Камунар» т. **Салкоўскі**, «Бальшавік»—т. **Бортнік**, швэйнай ф-кі—**Бакал**, № палка Беларускай дывізіі—т. **Хмяльніцкі**.

Пад шумныя воплескі канфэрэнцыя аднагалосна пастанаўляе паслаць прывітальную тэлеграму ЦК КП(б)Б.

Сёньня ў часе перапынку канфэрэнцыя ў сваю чаргу вызначыць дэлегацыі для прывітаньня рабочых шэрагу прадпрыёмстваў і чырвонаармейцаў вайсковых часьцей.

Па першаму пытаньню павесткі дню выступіў учора з дакладам старшыня Менскага АВК т. Аксючыц.

Прывітаньне ЦК КП(б)Б.

Лепшаму абаронцы батрацка-бядняцкіх інтарэсаў, вернаму правадыру рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, няўстаннаму кіраўніку індустрыялізацыі краіны і рэканструкцыі сельскае гаспадаркі на грунце калектывізацыі—ЦК КП(б)Б, 3-ая Менская Акруговая канфэрэнцыя груп беднаты шле шчырае братэрскае прывітаньне і запэўнівае ЦК у тым, што беднота Менскай акругі, як і раней, будзе рабіць усё для таго, каб у самы кароткі тэрмін калектывізаваць сельскую гаспадарку, і што ўсе кулацкія і іншыя варожыя элемэнты, якія паспрабуюць перашкаджаць справе калектывізацыі, сустрэнуць з боку беднаты самы жорскі адпор.

НЯХАЙ ЖЫВЕ СТАЛЁВАЕ АДЗІНСТВА УсеКП(б)!

НЯХАЙ УЗМАЦНЯЕЦЦА ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КАМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ САЮЗ РАБОЧАЕ КЛЯСЫ З БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКАЙ МАСАЙ СЯЛЯНСТВА!

Вялікія ваенныя манэўры ў Японіі.

ТОКІЁ 14-XI. 15-га лістапада ў прэфектурах Ібаракі і Цыба распачнуцца вялікія ваенныя манэўры ў прысутнасьці імпэратара. У манэўрах возьмуць удзел 3 дывізіі ў складзе 50.000 салдат, а таксама 120 самалётаў. Манэўры прадугледжваюць спробу сыстэмы кантролю ваенных дзеяньняў шляхам радыё-сувязі між самалётамі і штабам, а таксама пробную мабілізацыю цывільнага насельніцтва—сяброў гурткоў моладзі, студэнтаў і быўшых салдат.

Становішча падышаха Аўганістану.

ЛЁНДАН, 14-XI. Агенцтва Рэйтэра паведамляе з Пэшавару: „Становішча повага падышаха Аўганістану Надыр-хана зараз канчаткова ўмацавалася. Рэзыдэнцыя Надыр-хана знаходзіцца ў Кабульскай крэпасьці. Надыр-хан склікаў раду ўлады аўганскіх племяньняў. Ці запрапануе Надыр-хан радзе зацьвердзіць абвяшчэньне яго падышахам, пакуль што невядома".

Да падрыхтоўкі чарговых перавыбараў саветаў

Згодна пастановы Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту, з 15-га студзеня па 1 красавіка 1930 году у БССР будзе праведзена справаздачна-перавыбарчая кампанія сельскіх, местачковых і гарадзкіх саветаў, а таксама адбудуцца і раённыя зьезды саветаў.

Галоўнейшай адзнакай надыходзячай справаздачна-перавыбарчай кампаніі, у параўнаньні з папярэднімі, зьяўляецца тое, што яна будзе адбывацца ва ўмовах нябывала пасьпяховага (у выніках дасягненьняў бягучага году) сацыялістычнага будаўніцтва, паказаўшага і давёўшага ня толькі рэальнасьць выкананьня яе ў чатыры гады. Паказацелі, вынікі 1928-29 гаспадарчага году ў такіх важнейшых дзьвюх галінах, як разьвіцьцё буйнае індустрыі і калектывізацыя сельскае гаспадаркі, далёка пакінулі ззаду наметкі пяцігадовага плану і ўсякія кантрольныя лічбы. Гэта азначае, што ўся наша народная гаспадарка бурным тэмпам прасоўваецца наперад па шляху рашучай сацыялістычнай рэканструкцыі, прычым, што асабліва важна, дасягнуты рашучы пералом у напрамку разьвіцьця сельскае гаспадаркі на сацыялістычных падставах, даўшых магчымасьць аб'яднаць у калгасы раскіданыя бяднацка-серадняцкія гаспадаркі цэлых вёсак і раёнаў.

Сацыялістычнае спаборніцтва, перакрыцьцё выпускной сумы на 3-цюю пазыку індустрыялізацыі, пасьпяховае выкананьне хлебазагатовак, масавая цяга сялян у калгасы—усё гэта паказвае на справе рашучае падтрыманьне рабочымі і асноўнай масай сялянства ўсяе палітыкі партыі і Савецкай улады.

Аднак шпаркі тэмп сацыялістычнай рэканструкцыі гаспадаркі нашай краіны ня можа з посьпехам і поўнасьцю ажыцьцяўляцца без узмацненьня рашучага наступу на кулацка-нэпманскія элемэнты, што, зразумела, выклікае з іх боку на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва шалёнае супраціўленьне правядзеньню генэральнай лініі партыі ва ўсіх галінах у самых разнастайных формах. Супраціўленьне клясавага ворага мерапрыемствам партыі і савецкае ўлады знаходзіць свой адбітак сярод некаторай часткі працаўнікоў савецкага апарату і, нават, у паасобных членаў партыі, у выглядзе розных ухілаў і хістаньняў, правага апартунізму і левых загібаў.

Перавыбары саветаў, зьяўляючыся самай важнейшай масавай з правадзімых партыяй і савецкай уладай, кампаніяй, натуральна робяцца фокусам, у якім найбольш яскрава і шырока разгортваецца клясавая барацьба. Перавыбары саветаў ёсьць фактар, які актывізуе і ўцягвае ў сацыялістычнае будаўніцтва, у актыўнае кіраўніцтва нашай краінай новыя пласты рабочых і актыву працоўнага сялянства.

Перавыбарчая кампанія мінулага году прайшла пры надзвычайна ўзросшай актыўнасьці ўсіх працоўных гораду і вёскі і асабліва пралетарскай іх часткі. Агульны процант яўкі на выбары павялічыўся ў апошнюю перавыбарчую кампанію, у параўнаньні з папярэдняй, ад 46,3 проц. да 58,7 проц. па сельсаветах, ад 49,6 да 63,5 проц. па местачковых саветах і ад 62,4 да 71,1 проц. па гарадзкіх саветах. Пры гэтым яўка батрацтва і с. г. рабочых на вёсцы дасягае 70 пр., а рабочыя ў гарадох удзельнічалі ў перавыбарах на 79,2 проц.

Асабліва выявіўся ў мінулыя перавыбары рост актыўнасьці працоўных жанчын. У прыватнасьці, яўка сялянак на перавыбары с-с., замест 26,4 проц. у прадапошнюю кампанію, дасягнула 42,4 проц.

Нашай задачай у надыходзячыя перавыбары зьяўляецца ня спыняцца на посьпехах мінулай кампаніі, а паставіць ва ўсю шырыню пытаньне аб уцягненьні ў перавыбары саветаў поўнасьцю працоўных гораду і вёскі ўсіх нацыянальнасьцяў, бо адваротны бок вышэйпаданых лічбаў гаворыць за тое, што 41,3 проц. выбаршчыкаў на вёсцы, 36,5 проц.—у мястэчку і 28,9 проц. у горадзе яшчэ ня прычялі ніякага ўдзелу ў мінулых перавыбарах. Працоўная сялянка, ня гледзячы на вялізарны рост актыўнасьці, на 57,6 проц. яшчэ засталася па-за ўдзелу ў такой важнейшай палітычнай кампаніі жыцьця і будаўніцтва краіны, якой зьяўляецца перавыбары саветаў.

Сотні тысяч яшчэ адсталых рабочых, работніц, батракоў, батрачак і бядняцка-серадняцкага сялянства нам неасходна ўсямерна ўцягнуць у перавыбарчую кампанію, а праз кампанію—у сацыялістычнае будаўніцтва наогул.

У палітычных выніках апошняй перавыбарчай кампаніі мы мелі далейшае згуртаваньне рабочых і бядняцка-серадняцкіх мас вакол лініі партыі па шпаркі тэмп індустрыялізацыі прамысловасьці і калектывізацыі сельскае гаспадаркі, далейшае ўзмацненьне саюзу рабочае клясы з асноўнай масай сялянства і кіруючай ролі пралетарыяту ў гэтым саюзе, узмацненьне бядняцка-серадняцкага блёку і поўны крах імкненьняў кулака і нэпмана шырока пашкодзіць справе перавыбараў саветаў. Усе гэтыя дасягненьні павінны знайсьці ня толькі замацаваньне, але і далейшае сваё разьвіцьцё і паглыбленьне ў надыходзячую перавыбарчую кампанію.

Выкрыўшы бязьлітаснай крытыкай і самакрытыкай на выбарчых сходах усе недахопы работы саветаў, перавыбары павінны зрабіцца магутным штуршком далейшага ажыўленьня і палепшаньня работы саветаў і іх камісій, і гэтым самым павялічыць кіруючую ролю саветаў, ня толькі як адміністрацыйных органаў, але і як цэнтраў гаспадарча культурных, як кіраўнікоў калектывізацыі. Каб дамагчыся гэтых вынікаў, неабходна безадкладная дасканалая ўсебаковая падрыхтоўка перавыбарчай кампаніі, ва ўсіх яе галінах, па лініі ўсіх партыйных, савецкіх, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый. Наколькі своечасова партыйныя, прафсаюзныя і грамадзкія арганізацыі на мясцох шырока мабілізуюць свае сілы і ўвагу да падрыхтоўкі правядзеньня кампаніі, наколькі яны будуць выконваць і сачыць за выкананьнем дырэктыў партыі і ўраду, своечасна выкрываць і зьнішчаць недахопы,—ад гэтага ў найбольшай меры залежыць посьпех перавыбарчай кампаніі.

Неабходна зараз-жа падабраць клясава-вытрыманы і працаздольны склад выбіркомаў, наладзіць сыстэматычнае іх інструктаваньне і кіраўніцтва імі праз своечасовую рассылку дырэктыў і ўсіх неабходных матар'ялаў, мабілізуючы патрабную колькасьць адказных таварышоў для работы ў гэтым напрамку на мясцох, асабліва ў вёсцы.

Важнейшай умовай пасьпяховага правядзеньня кампаніі зьяўляецца добрая пастаноўка арганізацыйнай падрыхоўкі да кампаніі ўсяе грамадзкасьці, актывізацыя беднаты, батрацтва і працоўных жанчын, моладзі, дэмабілізаваных чырвонаармейцаў праз сыстэму адпаведных нарад, сходаў і канфэрэнцый, арганізацыя бядняцка-сераднядкага актыву, праверка выкананьня саветамі наказу мінулага году, пабудова канкрэтных яскравых справаздач, правільна высьвятляючых ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыімі паказаў выбаршчыкаў, прапрацоўка новых паказаў з прыцягненьнем шырокіх слаёў працоўных да намячэньня канкрэтных для ўмоў кожнага райёну мерапрыемстваў і заданьняў работы саветаў. Усебакова—ўважлівая падрыхтоўка кандыдатур у склад новых саветаў і для вылучэньня маючы на ўвазе ня толькі захаваньне, але далейшае ўзмацненьне, павялічанага ўжо ў мінулую кампанію, пралетарскага і партыйна-комсамольскага ядра ў саветах, яшчэ большае ўцягненьне ў саветы працоўных жанчын — ёсьць найважнейшая задача ў перавыбарах. Ва ўсёй рабоце надыходзячых перавыбараў ні ў якім разе нельга дапускаць памылак мінулагодняй перавыбарчай кампаніі, дзе мелі месца выпадкі ўшчамленьня інтарэсаў і ролі сераднякa ў выглядзе недапушчэньня яго на сходы беднаты недастатковага ўцягненьня сераднякa ў склад саветаў, выпадкі грубых памылак у справе пазбаўленьня і адпаўленьня ў выбарчых правох.

Складаньне сьпісаў выбаршчыкаў і асоб пазбаўленых выбарчага права павінна ўтварацца на падставе строгага кіраўніцтва інструкцыяй па перавыбарах саветаў бяз усякіх пропускаў асоб, падлягаючых пазбаўленьню выбарчага права.

Пазбаўленьне выбарчых правоў, як палітычны сродак нашай барацьбы з клясавым ворагам, пры шырокім прыцягненьні працоўных выбаршчыкаў да гэтай справы, павінна адыграць выхаваўчую ролю наглядной школы клясавай барацьбы пралетарыяту і асноўных мас сялянства супроць кулака, нэпмана і розных варожых дыктатуры пралетарыяту элемэнтаў гораду і вёскі.

Неабходна дабіцца таго, каб у гэтую справаздачна-перавыбарчую кампанію ня было ніводнае савецкае ўстановы, ніводнае прафэсыянальнае, каапэрацыйнае і грамадзкае арганізацыі наогул, якая-б засталася ў баку ад падрыхтоўкі і правядзеньня справаздачнасьці і перавыбараў. Трэба канчаткова зьнішчыць часткай захаваўшыяся памылковы, палітычна шкодны погляд нібы-та перавыбары саветаў зьяўляюцца справай толькі саміх саветаў і выканкомаў. Неабходна разумець кожнаму, што ўсякая арганізацыя і ўстанова, высьвятляючы ў час справаздачна-перавыбарчай кампаніі дасягненьні, недахопы і цяжкасьці ў сваёй працы перад шырокімі масамі працоўных, дапамагае актывізацыі выбаршчыкаў, дапамагае ўсьвядомленьню імі задач сацыялістычнага будаўніцтва ў сваёй галіне. Кожнае ведамства, установа і арганізацыя мае шэраг сродкаў і магчымасьцяў, якія павінны быць скарыстаны ў мэтах шырокай дапамогі падрыхтоўцы і пасьпяховаму правядзеньню перавыбарчай кампаніі.

Напрыклад, Наркамасьветы праз адпаведную арганізацыю кадраў прафэсуры, пастаўніцтва, студэнцтва і вучняў навучальных устаноў, праз сетку ўстаноў палітасьветы, тэатр, кіно, клюбы, хаты-чытальні, як і ў мінулыя кампаніі, мае магчымасьць сёлета аказаць яшчэ больш істотную дапамогу ў правядзеньні і падрыхтоўцы перавыбараў, як па частцы агітацыйна-прапагандысцкай, так і арганізацыйнай.

Можа і павінен накіраваць у дапамогу перавыбарчай кампаніі шырокія кадры кваліфікаваных працаўнікоў Наркам'юст. У прыватнасьці, спэцыфічнай працай органаў юстыцыі павінна быць арганізацыя юрыдычных лекцый, гутарак, кансультацый па пытаньнях выбарчага законадаўства, мабілізацыя апарату для дапамогі і нагляду ў справе складаньня сьпісаў асоб пазбаўленых выбарчага права і рэвалюцыйнай барацьбы з рознымі ўчынкамі клясавага ворага праз суды і пракуратуру.

Такія наркаматы, як ВСНГ, Наркамзем, Наркамфін павінны шырока азнаёміць выбаршчыкаў з задачамі па выкананьні пяцігадовага пляну, завастрыць іх увагу на гаспадарчай дзейнасьці саветаў, па ажыцьцяўленьні саветамі задач індустрыялізацыі і калектывізацыі, падатковай палітыкі, справы ашчаднасьці і распаўсюджваньня дзяржаўных пазык. Свае агранамічныя кадры Наркамзем павінен скарыстаць для прапаганды пераваг калектыўных форм земляробства і спосабаў уздыму сельскай гаспадаркі з тым, каб перавыбарчая кампанія памножыла, патроіла, удзесяцерыла дасягненьні гэтага году ў справе калектывізацыі вёскі.

Ва ўсёй кампаніі, як у горадзе, так і на вёсцы прафсаюзныя арганізацыі павінны адыграць вялізарную ролю. Арганізаваньня ўдарных брыгад па правядзеньні перавыбараў, мітынгаў-пераклічак, пасылка на вёску рабочых брыгад прадпрыемствамі і праз шэфтаварыствы, па прыкладу мінулай кампаніі, зьяўляецца важнейшай задачай удзелу прафсаюзаў у перавыбарах і сувязі рабочае клясы гораду з асноўнай масай сялянства вёскі. Прафсаюзы павінны скарыстаць гэтыя формы сувязі гораду і вёскі яшчэ больш шырока, пазбавіўшыся паасобных памылак мінулага году.

Камсамол, як непасрэдна па сваёй лініі, гэтак і праз прафсаюзныя і грамадзкія арганізацыі павінен быць застрэльшчыкам у справе ажыцьцяўленьня ўсіх мерапрыемстваў па дапамозе перавыбарам, павёўшы за сабою ў гэтай справе шырокія масы працоўнай моладзі і піянэрскую арганізацыю. Асноўнай работай БСМ павінна быць арганізацыя спэцыяльных брыгад пралетарскай моладзі, мабілізацыя атрадаў лёгкай кавалерыі для палітычнага адпору кулаку і нэпману для праверкі правядзеньня клясавай лініі саветамі і паасобнымі дэпутатамі, праверкі выкананьня наказу, дапамогі ў скліканьні і правядзеньні сходаў беднаты, выяўленьне ліквідацыі, дапамога ў прыцягненьні выбаршчыкаў па сходы, арганізацыя дагляду за дзецьмі і хатамі на час уходу жанчын-работніц і сялянак-бяднячак для ўдзелу ў справаздачных і перавыбарчых сходах.

Павінна таксама завастрыць увагу ўсяе членскае масы і мабілізаваць кадры свайго актыву на перавыбары саветаў наша каапэрацыя. Усе віды каапэрацыі аўладаюць, зразумела, агрэмістымі сіламі і сродкамі ў сацыялістычным будаўніцтве. Магутнасьць нашай каапэрацыі неабходна поўнасьцю скарыстаць для шырокага арганізаванага ўдзелу рабочых і бядняцка-сераднядкіх мас у перавыбарчай кампаніі.

Вялікую ролю ў справе актывізацыі і згуртаваньня бядняцкіх і маламоцна-сераднядкіх мас для адпору кулаку ў час перавыбараў на вёсцы, разам з іншымі грамадзкімі арганізацыямі, пад кіраўніцтвам партыі, павінны адыграць камітэты сялянскай узаемадапамогі.

Чырвоная армія ў мінулую перавыбарчую кампанію, апрача вялікай работы па правядзеньні кампаніі ў вайсковых частках, дала шэраг цікавых і надзвычайна карысных форм практычнай дапамогі ў перавыбарах грамадзянскім органам, як калектыўная пасылка лістоў, агітацыйныя лыжныя прабегі і эстафэты, удзел у мітынгах-пераклічках і г. д. Трэба спадзявацца, што наша Чырвоная армія яшчэ шырэй разгорне сыстэму гэтых мерапрыемстваў, яшчэ больш актыўна прыме ўдзел у гэтую перавыбарчую кампанію.

Урэшце, наш друк, як арганізатар ініцыятывы мас, павінен узмацніць сваю ролю ў кампаніі, падхопліваць і распаўсюджваць лепшы вопыт асобных месц, шырока асьвятляць дзейнасьць саветаў, адчыніць гураганны агонь самакрытыкі па ўсіх недахопах, бюракратызму і скажэньнях клясавае лініі ў саветах, выкрыць да канца ўсе махінацыі кулака і нэпмана, а таксама розных іншых ворагаў пралетарскай дыктатуры, усе факты прымірэнчых адносін да клясавага верага і заваёваньня клясавае барацьбы.

Своечасова і поўнасьцю мабілізаваўшы, такім чынам, сілы савецкай грамадзкасьці і сканцэнтраваўшы іх на справе перавыбараў, і чотка наладзіўшы справу арганізацыйнай падрыхтоўкі кампаніі, пад гэніяльным кіраўніцтвам нашай Ленінскай камуністычнай партыі, мы сёлета ў скарочаны, параўнальна з мінулымі гадамі, тэрмін здолеем пасьпяхова ажыцьцявіць вялізарныя палітычныя задачы, якія стаяць перад надыходзячай перавыбарчай кампаніяй.

А. ХАЦКЕВІЧ.

15-XI 29 г.

Працоўныя калёніі змагаюцца за сваё вызваленьне

НАДЫХОДЗІЦЬ ЧАС РАСПЛАТЫ, І ЯРМО ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ БУДЗЕ СКІНУТА.

Рэвалюцыйны рух у Інданэзіі.

БЭРЛІН, 13-XI. Прасьледваньне рэвалюцыйнага руху ў Інданэзіі ня спыняецца. Гэтымі днямі суд на высьпе Суматра засудзіў кіраўнікоў мясцовай арганізацыі інданэскай кампартыі Дотоэка на 2 гады зьняволеньня за «заклік да клясавай нянавісьці».

Гэтымі-ж днямі 400 кітайскіх рабочых на высьпе Суматра наладзілі мітынг пратэсту супроць затрыманьня заработку. Паліцыя арыштавала 4-х удзельнікаў мітынгу.

Бурныя хваляваньні тубыльцаў у Паўднёвай Афрыцы.

ЛЁНДАН, 14-XI. Хваляваньні сярод тубыльцаў у Паўднёвай Афрыцы набываюць шырокія разьмеры і выклікаюць трывогу ў афрыцыйных колах. Цэнтрам хваляваньняў зьяўляецца порт Вурбэн, самы большы з партоў на ўсходня-афрыканскім узьбярэжжы Паталь.

Вялікая дэманстрацыя пратэсту супроць ангельскага ўладаньня мела месца нядаўна ў цэнтры Трансвальскага раёну і Ёгганэсбургу. Дэманстрацыя тубыльцаў паўднёва-афрыканскага саюзу чакаецца 16-га сьнежня ў дзень нацыянальнай жалобы ў тыбульцаў. **Шырока праводзіцца сярод тубыльцаў кампанія за наўплату падушнага падатку. Фактычна з сакавіка месяца спынілася выплата гэтага падатку.**

Водлуг паведамленьня агэнцтва Рэйтэра, камісія будзе рабіць аблаву на тубыльцаў зьмэтаю праверкі выплаты падушнага падатку.

Як звычайна, кансэрватыўны ангельскі друк абвінавачвае ў гэтых хваляваньнях Камінтэрн.

* * *

ЛЁНДАН, 15-XI. Хваляваньні ў Дэрбэне прадаўжаюцца. Конная паліцыя, узброеная вінтоўкамі, кулямётамі і бомбамі, якія выклікаюць сьлязьлівасьць, абкружыла баракі студэнтаў (студэнты ў большасьці зьяўляюцца докерамі) і прапушчала іх па адным праз паліцэйскі кардон, які патрабаваў паказваць квіткі аб выплаце падушнага падатку. 600 чалавек, якія ня мелі квіткоў, былі арыштаваны і зараз-жа перададзены спэцыяльнаму суду.

У той час, як арыштаваныя накіроўваліся да назначанага для іх зборнага пункту, паліцыя разганяла рабочых, якія сабраліся навакол арыштаваных, пры дапамозе бомбаў, што выклікаюць сьлязьлівасьць.

Сутычкі паміж бастуючымі і паліцыяй.

НЬЮ-ЁРК, 14-XI. У апошні час пачасьціліся сутычкі між гарнякамі і вартаю капальняў на рудніках кампаніі „Іцбург Поль Кампані", большасьць акцый якой належыць міністру фінансаў Мэлёну. Надаўна 3 вартаўнікі рудніку зьбілі да сьмерці вэнгерскага горнарабочага Баркошы. Аднак, вартаўнікі былі апраўданы судом.

Апошняй ахвярай варты зьяўляецца горнарабочы негр Юнг, якога паліцэйскія забілі ў часе дэманстрацыі пратэсту збойства іншага гарняка-нэгра. Два ўдзельнікі дэманстрацыі былі арыштаваны і да гэтага часу знаходзяцца пад вартаю. Адначасна мясцовы суд апраўдаў паліцэйскіх, якія забілі Юнга.

У Саюзных Рэспубліках.

Даганяем і перагонім.

МАСКВА, 13-XI. Мы будуем волаты-заводы і фабрыкі, зраўнацца з якімі могуць толькі адзіночныя прадпрыёмствы Эўропы і Амэрыкі. У галіне мэталюргіі, напрыклад, самы буйны завод у Заходняй Эўропе можа даць 1.400.000 тон чыгуну ў год. А Магнітагорскі завод, які будуецца ў нас, мяркуецца магутнасьцю ў 1.100.000 тонн. Завод імя Дзяржынскага, пасьля яго рэканструкцыі ў канцы пяцігодкі дасьць 1.400.000 тон у год, а зараз распрацоўваецца пытаньне аб тым, каб выплаўку чыгуну на гэтым заводзе павялічыць да 2-х мільёнаў тон. Нашы мэталюргічныя волаты апыняцца на першым месцы ў Эўропе, саступаючы па магутнасьці толькі некалькім самым буйным заводам Амэрыкі.

Па с.-г. машынабудаўніцтву мы выпераджаем Эўропу і Амэрыку. Сталінградзкі завод, які будзе пушчаны ў ход у 1930 г., будуецца з разьлікам на 40-50 тысяч трактараў у год. Гэта, прыблізна ў паўтары разы перасягае вытворчасьць трактарных заводаў Амэрыкі. Растоўскі завод с.-г. машын дасьць прадукцыі на 120 міліёнаў рублёў, будзе самым вялікім у Эўропе і наўрад ці саступіць па сваёй магутнасьці буйнейшым прадпрыёмствам Амэрыкі.

У галіне электрычнай прамысловасьці ДЭТ (дзяржаўны электрычны трэст) пачынае ў 1930 годзе будаваць у Маскве кабельны завод, разьлічаны на выпуск прадукцыі ў 175 міліёнаў рублёў. Маскоўскі кабельны завод увойдзе ў лік самых вялікіх у сьвеце заводаў. У Ленінградзе будуецца турбінны корпус, які здолее выпушчаць турба-генэратары па 75 тысяч кілёват.

У тэкстыльнай прамысловасьці будуецца мэлянжавы камбінат у Іванаво-Вазьнясенску, пушчаны ўжо часткова ў ход, разьлічаны на выпуск 75 міліёнаў мэтраў у год. Мэлянжавы камбінат будзе самым вялікім у сьвеце прадпрыёмствам па вырабу тканіны на вопратку.

У 1930 годзе Трактарацэнтр мяркуе наладзіць пуск новых машынна-трактарных станцый, у тым ліку на Украіне—65, Паўночным Каўказе—30, Цэнтральнай Чорназемнай вобласьці—10, Ніжняй Волзе—18, Сярэдняй Волзе—23, Урале—10, Сібіры—15, Казакстане—10 і г. д. На трактарных станцыях у 1930 г. будзе працаваць 25 тысяч трактараў. Некалькі трактарных станцый будзе заснавана у баваўняных, бурачных, ільняных і малочна-гародных рэйнах.

Лепшыя пралетарыі—у шэрагі УсеКП(б).

СМАЛЕНСК, 12-11. 12-я ўгодкі Кастрычніка працоўныя Заходняй вобласьці адзначылі масавым уступленьнем у партыю. Водлуг вестак, толькі ў 4-х акругах у партыю ўступіла 304 асобы, з іх 230 рабочых ад варштату, а рэшта—батракі, калгасьнікі і беднякі.

Павялічыць удзел прафсаюзаў у чыстцы апарату.

МАСКВА. УЦСПС прапануе прафарганізацыям павялічыць свой удзел у чыстцы апарату народнай асьветы ад варожых элемэнтаў. УЦСПС лічыць неабходным высунуць у органы народнай асьветы рабочых і перадавых асьветнікаў, а таксама пэдагогаў-практыкаў, якія паказалі сябе з добрага боку на грамадзкай і пэдагагічнай працы.

„Страна Советов" варочаецца ў СССР.

НЬЮ-ЁРК, 14-XI. Экіпаж „Страны Советов" вылятае з Нью-Ёрку ў СССР 27-га лістапада.

Сёньня адчыняецца ўнечарговы V зьезд сэкцыі працаўнікоў друку БССР.

Унечарговы 5-ты Зьезд Сэкцыі Працаўнікоў Друку БССР адчыняецца сёньня 16-га лістапада а 7 гадзіне ўвечары ў клюбе друкароў.

Пасяджэньне францыі Зьезду а 5-й гадзіне ўвечары там-жа.

Парадак дню зьезду:

1) Палітычная задача друку (дакладчык т. Будзінскі).
2) Справаздача ЦБ сэкцыі працаўнікоў друку (тав. Лазар).
3) Асноўныя паказальнікі 5-цігодкі друку (даклад камітэту па справах друку тав. Мілішкевіч).
4) Выбары Белбюро.
5) Бягучыя справы.

На пасяджэньне зьезду запрашаюцца члены саюзу друкароў і рабкоры.

ЦП саюзу друкароў і аргбюро па скліканьню зьезду.

ДВАНАЦЦАЦЬ ГОД ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЫКТАТУРЫ

Капіталістыя і абшарнікі ўсяго сьвету прарочылі, што Савецкія Рэспублікі будуць існаваць толькі некалькі дзён ці тыдняў. Рэвалюцыйным уздымам рабоча клясы ўсе іх прароцтвы разьбіты, і СССР уступіў у XIII гадавіну свайго існаваньня. XII-ты год Кастрычнікавай рэвалюцыі—год вялікага пад'ёму, вытворчаг энтузыязму рабочай клясы. Імпэрыялісты рыхтуюць ваенны напад на СССР. Савецкі Саюз хоча міру і не дазволіць нікому парушаць яго мірнае сацыялістычна будаўніцтва. Далейшае разгортваньне актыўнасьці і ініцыятывы працоўных мас пад кіраўніцтвам кампартыі ў справе будаўніцтва цяжкай індустрыі, калектывізацы сельскай гаспадаркі і рашучага наступу на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі забясьпечыць поўную перамогу сацыялізму над капіталізмам.

Даклад тав. ГАЛАДЗЕДА на ўрачыстым пасяджэньні Менскага Гарсавету 7 лістапада 1929 году.

Працоўныя СССР разьбілі ўсе прароцтвы капіталістаў і абшарнікаў.

Таварышы, наперакор капіталістычнаму сьвету і ўсім прарокам з белагвардзейкага лягеру, пралетарыят Савецкага Саюзу сьвяткуе XII-ю гадавіну сваіх перамог у барацьбе за пралетарскую рэвалюцыю. Усім нам памятны тыя дні, калі рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі бальшавікоў вышвырнула магутным ударам рэвалюцыйных мас,за межы пралетарскае дзяржавы, усе падонкі былой капіталістычнай грамады. І вось гэтыя астаткі былых людзей, астаткі белагвардзейшчыны прарочылі рабочым і селянам Савецкага Саюзу, што савецкая ўлада будзе жыць ня больш, як 10 дзён. Пасьля яны наказывалі жыць нам 10 тыдняў, а потым 10 месяцаў. А мы, наперакор ім, пражылі 12 год і прароцтвы белагвардзейскіх адбросаў ня збыліся. Як вы думаеце, ці ўпэўніўся капіталістычны сьвет, у тым ліку і тыя адкіды парыскіх рэстаранаў з былых людзей царскай Расеі, якія жывуць пад крылышкам капіталізму, ці ўпэўніліся яны ў тым, што мы будзем жыць ня толькі 12 год, а і 120? Яны ня хочуць з гэтым прымірыцца і ня думаюць складаць аружжа ў барацьбе супроць сацыялістычнай сусьветнай рэвалюцыі і Савецкага Саюзу Сацыялістычных Рэспублік. Нават і такія адкіды чалавецтва, якія застралі ў Рыме, Бэрліне, Парыжы, таксама мараць і вылічваюць аб тым, колькі засталося бальшавікам панаваць у Савецкім Саюзе.

29 верасьня 1929 г. белагвардзейская газэта, якая выдаецца ў Рызе пад назвай „Сегодня", вьвяткавала сваю 10-ю гадавіну; яна зьвярнулася ў гэтым нумары з анкетай да белагвардзейскіх дзеячоў пад такім загалоўкам: «Што будзе праз 10 год з Расіяй?» У адказ на такое запытаньне белагвардзейскай газэты яе ідэалёгіі па рознаму пішуць. Але тут характэрна ня так тое, што яны пішуць, а характэрна тое, што калі ў першыя дні заваёвы ўлады пралетарыятам нашы клясавыя ворагі прарочылі нам жыць 10 дзён, дык цяпер і белагвардзейская газэта ставіць пытаньне да сваіх ідэалёгаў—што будзе праз 10 год. Такім чынам на 10 тыдняў, на 10 месяцаў і яны ўжо не разьлічваюць, а гістарычны ход пралетарскай рэвалюцыі, гістарычны ход будаўніцтва сацыялізму ўжо і нашыя клясавыя ворагі пачынаюць вымяраць дзесяткамі гадоў. З адказаў на анкету можна бачыць наколькі зьнішчана, наколькі дробна ўся гэта застаўшаяся белагвардзейская свора, што яна ня толькі ня можа даць адказу на пытаньні аб будучым, а яна ня можа правільна арыентавацца ў сучасным міжнародным становішчы і ўразумець сацыяльна-клясавыя працэсы, якія праходзяць ва ўсім сьвеце.

Белагвардзейцы мараць аб „недзялімай", а працоўныя будуюць сацыялізм.

Усё-ж такі цікава аб чым яны мараць. Напрыклад, прадстаўнік барскай інтэлігенцыі нядомы абшарніцкі пісьменьнік Іван Бунін, які ў сваіх творах аплаківаў разбураючыяся маёнткі і ня бачыў новае клясы—пралетарыяту і разводзіў пэсымізм і охі па адміраючай барска-абшарніцкай клясе, ён так ставіць пытаньне: «Што ўгодна я згодзен убачыць праз 10 год, толькі-б ня было бальшавіцкай Расеі». Купрын, у адказе на запытаньне, ставіць наступную задачу: «Мое презрение сквозь будущие года и лета стало от напряжения туманно, оно как-то двоится. Иногда и я вижу бледный расцвет России, иногда мерцание приходит с юга, иногда с востока, одно я вижу ясно, что через 10 лет редакция „Сегодня" не обратиться ко мне за ответом о будущем России...". Ён не гавора прычыны, дзякуючы якой да яго рэдакцыя газэты „Сегодня" ня зьверпецца з такім запытаньнем праз 10 год, але мы яму можам падсказаць, што і ён і рэдакцыя газэты ня будуць існаваць праз 10 год. Мы ўпэўнены ў тым, што праз 10 год там, дзе яны сядзяць сёньня, таксама будзе пралетарская рэвалюцыя і будзе дыктатура пралетарыяту, якая ня пазволіць ніякім адкідам вобчаства сядзець у пралетарскай дзяржаве.

Я ня буду запімаць вашай увагі яшчэ цэлым шэрагам адказаў на вусім пустыя запытаньні з боку гэтай белагвардзейскай газэты, але факт той, што і Какоўцаў, былы старшыня савету царскіх міністраў, дае адказ і генэрал Баратаў і Алданаў і г. д., нагул тут цэлая плеяда тых былых людзей, якіх рабочая кляса ў дні вялікага Кастрычніка 17-га году выкінула жалезнай пралетарскай мятлой за абшары Савецкага Саюзу. Усе яны там мараць аб былых днях, але няхай сабе мараць, бо недарма-ж іх сусьветны капіталізм трымае на хлебах. Яны на задворках буржуазных рэстаранаў «варожаць на кафэйнай гушчы», а мы будуем новае сацыялістычнае жыцьцё.

Дагнаць і перагнаць капіталістычныя краіны.

Таварышы, XII-ты год пралетарскай рэвалюцыі знаменацелен бурным і магутным ростам пазіцый сацыялізму, ён знаменацелен глыбокім магутным пераломам на ўсіх франтох нашага будаўніцтва. XII-ы год Кастрычнікавай Рэвалюцыі зьяўляецца годам вялікага пад'ёму, нячуванага дагэтуль вытворчага энтузіязму шырокіх рабочых мас. Сьвет яшчэ ня бачыў такой магутнай пралетарскай энэргіі, якая разгарнулася на фронце сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР. Гэта і ёсьць тое новае, тое адзначнае, што адбывалася на працягу 12-га году Кастрычнікавай рэвалюцыі, чаго мы не маглі бачыць у першыя гады. Прычым гэты каранны пералом у нашым росьце, ён праводзіўся на працягу апошніх часоў пад знакам рашучага і ўзмоцненага наступу сацыялізму на капіталізм, наступу пралетарскіх пазіцый на кулацка-нэпманскія элемэнты. Гэты год праходзіў ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы, у якой пралетарыят усё больш і больш замацоўвае свае пазіцыі. Гэта тая адзначная характэрнасьць, якой знаменуецца 12-ты год Кастрычнікавай рэвалюцыі.

У мінулыя гады, калі мы падводзілі вынікі нашых дасягненьняў, мы рабілі параўнаньні ў нашых дасягненьнях на гаспадарчым фронце з даваенным часам. Даваенны ўзровень гаспадаркі былой царскай Расеі ў папярэднія гады пралетарскай рэвалюцыі быў асноўным вымернікам нашага паступовага ходу ўперад ад тэй разрухі, якую нам пакінула імпэрыялістычная вайна 1914-1918 г. г. Але сёньня гэтае параўнаньне з даваенным пэрыядам мы пакінулі ўжо даўно і далёка пазадзі. Сёньня мы праводзім параўнаньне з тым, як мы выконваем лёзунг вялікага настаўніка і правадыра пралетарыяту Леніна, лёзунг нашай партыі аб тым, каб «дагнаць і перагнаць перадавыя капіталістычныя дзяржавы ў тэхнічна-эканамічных адносінах». Гэта зараз ужо для нас павінна быць асноўным вымернікам нашых дасягненьняў, бо мы ўступілі ў пэрыяд глыбокай і каранной сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй нашай народнай гаспадаркі. І вось як наша сацыялістычная рэканструкцыя перагавае рэканструкцыю капіталістычную ў тэхнічна-эканамічных адносінах, гэта і зьяўляецца асноўнай праверкай нашых посьпехаў на фронце будаўніцтва сацыялізму.

Ці можам мы сёньня, у дзень сьвяткаваньня XII-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі, пахваліцца пад кутом погляду гэтага вымерніка нашымі дасягненьнямі? Да, можам. **Мы ўжо стаім абедзьвума нагамі на шляху тэхнічнай рэвалюцыі ў нашай народнай гаспадарцы, ва ўсёй краіне саветаў; мы ўжо стаім абедзьвума нагамі на рэйках апераджэньня капіталістычнай тэхнікі.**

Нашы ворагі таксама прызнаюць рост нашай магутнасьці.

Я ня буду прыводзіць вам тых шматлікіх прыкладаў для сьцьвярджэньня гэтага, якія ў нас маюцца. У друку ў нас падрабязна высьвятляюцца нашы дасягненьні, як у гаспадарцы, так у навуцы і ў тэхніцы.

Скажу толькі, што ня толькі факты культурна-тэхнічнага і эканамічнага нашага росту, але нават і думкі паасобных прадстаўнікоў капіталізму таксама сьцьвярджаюць такое становішча, якое мы маем з разьвіцьцём тэхнікі і культуры ў нашым сацыялістычным жыцьці.

Досыць спаслацца на шэраг карэспандэнцый, якія друкуюцца ў буржуазных і капіталістычных газэтах у Эўропе і Амэрыцы, каб паказаць, як нават і прадстаўнікі капіталізму, якія вядома не зьяўляюцца савецкімі грамадзянамі, якіх ні ў якім разе ня можна западазрыць у сымпатызываньні савецкай уладзе, таму што савецкая ўлада—гэта ёсьць прадвесьнік пагібелі, магільшчык для капіталістычнага сьвету, але ўсё-ж такі і яны гаворыць, што тое, што робіцца ў Савецкім Саюзе, як у галіне індустрыі, так і ў галіне рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, асабліва ў галіне сельскай гаспадаркі па шляху яе сацыялістычнага ператварэньня і арганізацыі буйнага земляробства на падставах калектывізацыі, што гэтаму можа пазаздройсьціць любая капіталістычная дзяржава, у тым ліку і капіталістычна-фэрмэрская сельская гаспадарка Амэрыкі. Так пішуць амэрыканскія карэспандэнты, так пішуць бэрлінскія карэспандэнты, прадстаўнікі самых ярасных капіталістычных колаў.

Вытрымкі з гэтых карэспандэнцый я ня буду вам прыводзіць, таму што гэта зойміць шмат часу, асноўныя з іх былі ў нашых газэтах надрукованы. Больш таго, тыя людзі, якія падрабязна пават і пад пунктам гледжаньня капіталістычнага аналізу вызываюць сапраўдныя працэсы, якія праводзяцца ў народнай гаспадарцы Савецкага Саюзу, і тыя сацыяльна-клясавыя зрухі, якія маюцца ў нашай дзяржаве, яны прыходзяць нават да палітычных вынікаў, вынікаў, супроць якіх мы нічога ня маем.

Адзін з карэспандэнтаў буржуазнай газэты піша з Масквы, што тая барацьба ў вёсцы, якая зараз адбываецца ў Савецкім Саюзе, ня ёсьць барацьба сялянства са сваёю ўладаю, а ёсьць барацьба двух клясаў: клясы, якая падтрымліваецца савецкаю ўладаю і Камуністычнай партыяй (чытай беднаты і серадняка) і з другога боку кляса буйных кулакоў, і вось у вёсцы адбываецца барацьба гэтых клясаў. Гэтая ацэнка прадстаўніка капіталістычнага друку і, па-мойму, зусім правільная. Супроць такой ацэнкі мы можам і не супярэчыць, хоць яна і даецца прадстаўнікамі капіталізму. Аб чым гэта гаворыць? Гэта гаворыць аб тым, што варта любому прадстаўніку буржуазных колаў зазірнуць у рэальнасьць нашай эканомікі і палітычна-грамадзкіх адносін, дык і ён можа, хоча ён гэтага ці не, убачыць сапраўдны паступацельны працэс на фронце заваёў пазыцый сацыялізму.

Наша будаўніцтва адбываецца ва ўмовах жорсткай клясавай барацьбы.

Таварышы, але тое, што мы робім і што мы маем у якасьці дасягненьняў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, усё гэта праводзіцца намі ў вельмі цяжкіх варунках, усё праводзіцца ў варунках жорсткай барацьбы міжнароднага капіталу супроць Савецкага Саюзу. Гэта значыць, што і дагэтуль былі жорсткія ўмовы міжнародных узаемаадносін. Гэтага ніколі ня трэба выпускаць з нашага гарызонту. Пытаньні міжнародных узаемаадносін Савецкага Саюзу былі, ёсьць і будуць заставацца адной з тых прычын, якія ў некаторай ступені апраздяляюць умовы нашага наступацельнага ходу наперад да сацыялізму. Бо вы ведаеце, што эканамічная блёкада ў пэрыяд мірнага сацыялістычнага будаўніцтва яна няскончана, як адкрытае, так і скрытае эканамічнае даўленьне капіталістых супроць Савецкага Саюзу адбываецца бесперапынна і мы прымушаны вытрымліваць гэты вялікі тэмп сацыялістычнага будаўніцтва і росту на ўласныя сродкі.

Няма часу і думаць аб тым, каб мы разьлічвалі і ў далейшым, пакуль жыве капіталізм, на шырокія крэдыты для мэт нашай індустрыі. Праўда, нашы ўзаемаадносіны ў галіне эканомікі з кожным годам пашыраюцца з рознымі капіталістычнымі дзяржавамі, бо і паасобным капіталістычным дзяржавам і паасобным капіталістым карысна мець экакамічныя ўзаемаадносіны з індустрыялізуючайся, з непамерна хутка растучаю краінаю, якая можа спажываць і ўжо спажывае на сотні мільёнаў рубл. вытворчасьці прамысловай прадукцыі, якая спажывае для свайго сацыялістычнага будаўніцтва на міліярды рублёў розных прылад, з якіх будуецца сацыялістычная гаспадарка. Але тут у капіталістых змагаюцца два пачаткі: адзін пачатак—імкненьне заработаць ад Савецкага Саюзу, на ўстанаўленьні гандлю з намі,—другі пачатак—гэта прынцыповая клясавая варожасьць да тых асноўных прынцыпаў, якія заложаны ў сыстэме савецкай дзяржавы. Ня гледзячы на гэта, мы ўсё-ж такі пашыраем нашыя эканамічныя ўзаемаадносіны з цэлым шэрагам капіталістычных краін.

Наша ўстаноўка ў міжнародных пытаньнях—на мір.

Калі-ж коратка спыніцца на пытаньнях міжнароднай палітыкі, дык іх можна было-б у кароткіх рысах фармуліраваць наступным чынам: вузлавымі пунктамі міжнароднай палітыкі і дагэтуль, як і раней, зьяўляюцца наступныя пытаньні: па-першае, узаемаадносіны Савецкага Саюзу з аднаго боку і капіталістычных дзяржаў—з другога, і, па-другое, барацьба паміж Амэрыкаю і Заходнім Эўрапейскім кантынентам за гэгэмонію на сусьветным рынку; па-трэцяе,—кітайскі вузел і, па-чацьвертае, рост супярэчнасьцяў паміж капіталістычнымі дзяржавамі Заходняй Эўропы за гэгэмонію на эўрапейскім кантынэнце. Вось, прыкладна, вузлавыя пункты міжнароднай палітыкі.

Я не гавару ўжо аб тых сацыяльна-клясавых супярэчнасьцях, якія растуць унутры капіталістычных дзяржаў, бо ў гэтых адносінах рэвалюцыйны рух рабочае клясы ва ўсім сьвеце ідзе настолькі шпаркім тэмпам наперад, што мы ўпэўнены ў тым, што ў бліжэйшы час пытаньне пралетарскай рэвалюцыі ў шэрагу капіталістычных дзяржаў Эўропы зьяўляецца пытаньнем рэальным, яно ўжо стаіць у парадку дня.

Як абстаіць справа з палітыкаю Савецкага Саюзу ў адносінах да капіталістычных дзяржаў, а таксама і капіталістычных дзяржаў у адносінах да Савецкага Саюзу. Трэба сказаць, што за апошні год на Захадзе ў нас асаблівых перамен ня здарылася ў міжнароднай палітыцы Савецкага Саюзу. Наша асноўная ўстаноўка на мір, на ўстанаўленьне міру яна застаецца гэнэральнаю ўстаноўкаю на працягу ўсяго часу ў адносінах да ўсіх капіталістычных дзяржаў, але ня ўсюды ўдаецца нам гэтую палітыку ажыцьцявіць, таму што гэта няпрыемліма імпэрыялістычнай буржуазіі.

СССР не дазволіць нікому парушаць яго мірнае будаўніцтва.

Найбольш сушчэственным фактам нашай міжнароднай палітыкі зьяўляецца такое пытаньне, як канфлікт на Ўсходня-Кітайскай чыгунцы. Справа ў тым, што гэта ня толькі канфліктаваў Кітай з Савецкім Саюзам, а што гэта ёсьць канфлікт капіталістычнага імпэрыялізму з намі, які ператварае, Кітай у сваю калёнію. Справа ў тым, што за сьпіной Чан-Кай-Шы стаіць амэрыканскі і ангельскі капітал, і толькі дзякуючы гэтаму, канфлікт на ўсходзе Кітайскай чыгунцы для нас мае сусьветнае значэньне, паўтараю, таму, што канфлікт з кітайскімі гэнэраламі, гэта зн. канфлікт з міравым імпэрыялізмам. Урад Савецкага Саюзу рабіў усё для таго, каб уладзіць узаемаадносіны з Кітаем, з тым Кітаем, для якога Савецкая ўлада адмовілася ад усіх былых прывілёгій царскай Расеі, якія былі на тэрыторыі Кітаю. Савецкі Саюз—адзіная дзяржава, якая па ўласнай ініцыятыве пайшла на ўстанаўленьне раўнапраўных дагавароў паміж дзьвюма вялікімі дзяржавамі—СССР і Кітаем. Ня гледзячы на гэта пры нацкоўваньні сусьветнага імпэрыялізму, гэты дагавор кітайскімі Чан-Кай-Шы парушаны. Мы і цяпер робім і рабілі ўсё для таго, каб устанавіць нармальныя ўзаемаадносіны, каб ліквідаваць канфлікт, які склаўся, але з другога боку кітайскія гэнэралы з намі іграюць. А мы не пазволім з намі іграць, што на ўступкі Чан-Кай-Шы мы ня пойдзем. Мы нашы інтарэсы, інтарэсы Савецкага Саюзу і інтарэсы савецкай мяжы будзем абараняць усёй сілай пралетарскай дзяржавы. Мы будзем да канца цьвёрдымі, ніякіх уступак рабіць ня будзем, адначасова прымаўшы ўсе меры да таго, каб уладзіць мірным шляхам пытаньне. Дзякуючы такому палітычнаму становішчу ў адносінах да Кітаю, нам прышлося ўзмацніць нашу Чырвоную Армію на Ўсходняй мяжы, і ўсе чырвоаармейскія часткі, якія там былі ў нас на Ўсходзе, аб'ядніліся ў адну Далёка-Ўсходнюю армію. Мы цяпер бачым, што гэты брані́раваны кулак пралетарскай дзяржавы дае нам магчымасьць вясьці і далей пасьлядоўна да канца цьвёрдую палітыку па Далёкім Усходзе. Ніякіх уступак—такі наказ працоўных СССР. Праўда, мы маем такое становішча, што часамі та вельмі завастраюцца ўзаемаадносіны па тэй прычыне, што на тэрыторыі Кітаю фармуюцца белагвардзейскія банды. Гэтыя банды на сродкі капіталістычных дзяржаў перакідаюцца на нашу тэрыторыю, тэрарызуюць мірнае насельніцтва, шкодзяць мірнаму будаўніцтву. Але мы гэтыя булавачныя ўколы, якія праводзяцца праз белагвардзейскія банды і паасобныя кітайскія атрады, адбіваем, мы бароцца з імі пасьпяхова і нікому не дазволім мяшаць нашаму мірнаму будаўніцтву і на Далёкім Усходзе, як і ва ўсім Саюзе.

Польшча эканамічна заняпала.

Трэба яшчэ з пытаньняў міжнародных адносін адзначыць такое пытаньне, як нашы ўзаемаадносіны з Польшчай, з нашай бліжэйшай суседкай. Я павінен адзначыць, што ва ўзаемаадносінах Польшчы з намі на працягу ўсяго часу існаваньня было больш цёмных плям, чым добрасуседзкіх узаемаадносін. Урад пілсудчыкаў ня хоча з намі мірна жыць. Запімненьне на гарызонце паяўляецца вельмі часта, і вось у сучасны пэрыяд узаемаадносіны Польшчы з намі знаходзяцца ў такім становішчы, калі на гарызонце паяўляюцца хмары. Па якіх прычынах нашы ўзаемаадносіны ня ідуць на лад з Польшчай. Трэба адзначыць, што ў сучасны пэрыяд унутранае становішча Польшчы такое, што яно ідзе прамымі крокамі да вернага эканамічнага краху. Прыход да ўлады Пілсудзкага пасьля так званага майскага перавароту ня выратаваў Польшчу ад эканамічнага крызісу. Гэты прыход быў, праўда, тады, калі Польшча на вугольнай ангельскай забастоўцы тое сёе зарабіла, павялічыла здабычу вугля ў сябе, павялічыла экспарт, крыху ўзмацніла валюту, але гэта скора скончылася і з тых пор у разьвіцьці эканомікі Польшчы ня відна сьветлага дню.

Толькі паўгода таму назад мне прышлося на Зьезьдзе Саветаў БССР падаць некаторыя факты аб яўным эканамічным крызісу ў Польшчы, у які яна ўвайшла ў 1928-29 г. Прайшло паўгода, становішча нічуць не зьмянілася. Пытаньне эканамічнага крызісу ў Польшчы ня сходзіць з парадку дню, і адкравенныя ці, вярней, маламальскі аб'ектыўныя эканамісты Польшчы адкрыта заяўляюць, што пытаньне дэпрэсіі, пытаньне расшатываньня кан'юнктуры зьяўляецца рэальнасьцю для гаспадаркі Польшчы. Аб гэтым піша вядомы эканамісты Польшчы Кжыжаноўскі, які карыстаецца ў іх нямалым пачотам ва ўрадзе Пілсудзкага, як выдатны эканаміст.

Польскія генэралы будуюць ваенныя пляны супроць СССР.

Я ня буду прыводзіць шэрагу прыкладаў, якія сьведчаць аб сапраўдным крызісе ў эканамічным становішчы Польшчы, але тут справа ня толькі ў тым, як будзе ў далейшым разьвівацца эканоміка Польшчы, а справа ў тым, што ўрад Пілсудзкага выводзіць сваё панаваньне на тым, што ён, ня будучы ў сілах памеціць рэальнага пляну эканамічнага аздараўленьня для Польшчы, як фашыстаўскай дзяржавы, ён сваё панаваньне будуе на разьвіцьці нацыяналізму і патрыацызму польскага насельніцтва, галоўным чынам, польскай буржуазеі. Гэты патрыяцызм разьвіваецца шляхам абвастрэньня ўзаемаадносін з Савецкім Саюзам, ківаючы на ваенную пагрозу. Польскія гэнэралы будуюць ваенныя пляны супроць Савецкага Саюзу, і вось у сучасны пэрыяд, дзякуючы цяжкасьці эканамічнага становішча ў Польшчы, вална шалёнай траўлі Савецкага Саюзу разгарнулася даволі шырока. Вална варожасьці да СССР, нацыянальнай варожасьці—гэта вална шырока раскацілася па ўсёй буржуазнай фашыстаўскай Польшчы, і ў апошні час па прыкладу 1927 г. мы маем шалёную траўлю польскай фашыстаўскай урадавай прэсы супроць нашага паўнаважнага прадстаўніцтва ў Варшаве, як усяго прадстаўніцтва, так і паасобных яго дзеячоў. Гэта зьяўляецца асноўнай тэмай усёй польскай прэсы. Адпаведная падрыхтоўка вядзецца фашыстаўскім друкам і па другіх галінах. Палітыка польскага ўраду да меншасьцяў Польшчы таксама зьмянілася. Напрыклад, у адносінах да левага радыкальнага напраўленьня нацыянальнага руху польскі ўрад вядзе пасіленую барацьбу, а болей прадажніцкую верхавіну з меншасьцяў пачынае купляць за паасобныя падачкі для таго, каб праз іх, як, напрыклад, праз беларускіх луцкевічаў, станкевічаў, астроўскіх і прэмічаў усё больш і больш настрайваць масы супроць Саюзу ССР і супроць БССР.

Такім чынам, пытаньне ўзаемаадносін Польшчы з намі заслугоўваюць асаблівай увагі, бо яно зьяўляецца ўзаемаадносінамі ўсё больш пагражаючымі.

Нам трэба ліквідаваць магчымасьць абвастрэньня ваеннай пагрозы з Польшчай

Такім чынам, з гэтага факту відна, што пытаньне вайны капіталістаў супроць Саюзу ССР на гарызонце выяўляецца найбольш яскрава. Ці значыць гэта, што будзе ў бліжэйшы час вайна? Савецкая ўлада заўсёды рабіла ўсё магчымае дзеля таго, каб не дапускаць вайны, мы працярпелі не такія козьні ў 1927 годзе і зрабілі ўсе, каб не дапусьціць вайны, дзеля таго, каб ліквідаваць магчымасьць ваеннай сутычкі. Наш урад прыме і ў далейшым усе меры да таго, каб паралізаваць тую шалёную кампанію, якая вядзецца польскім друкам супроць мас, ясна па дырэктывам польскага ўраду, мы зрабілі ўсё дзеля таго, каб паралізаваць гэтую шалёную сьвістапляску супроць Савецкага Саюзу, за абвастрэньне ўзаемаадносін а намі, якая ў Польшчы вядзецца, але калі фашыстыя будуць і надалей травіць нас і набліжаць ваенную пагрозу, то савецкая ўлада зможа даць добрай здачы.

Такім чынам, вастрата пытаньня сёньня ва ўзаемаадносінах польскага ўраду з намі застаецца, аб чым рабочыя і сяляне, а асабліва—Савецкай Беларусі, павінны ведаць. Вось аб чым можна было, па-мойму, для прыкладнага высьвятленьня нашых міжнародных узаемаадносін гаварыць дзеля таго, каб уявіць нашыя задачы на наступны год у міжнароднай палітыцы. Яны застаюцца наступнымі: па-першае, імкненьне ўсімі мерамі, усімі сіламі мірна ўладзіць канфлікт на Кітайскай граніцы, на Кітайска-Усходняй чыгунцы.

Наша задача вось тут на бліжэйшай граніцы, на Заходняй зрабіць усё для таго, каб ліквідаваць магчымасьць абвастрэньня ваеннай пагрозы з Польшчаю, як з дзяржаваю, якая зьяўляецца ня больш—ня менш, як проста куклаю ў руках капіталістычна-эўрапейскіх дзяржаў. Вось што, па-майму, можна было коратка сказаць па пытаньню міжнародных узаемаадносін.

(Канец у наступным нумары)

Вынікі чысткі апарату па БССР

Увогуле частковая чыстка апарату, праведзеная дагэтуль па БССР, прайшла нездавальняюча. Аб прычынах гэтага і аб мерах па паленшаньні прыдзецца гаварыць асобна. Зараз дадзім тыя пэўныя вынікі, якія атрымалі мы па чысткі.

Што выяўлена па агульнай працы апарату.

Калі наогул праверка працы апарату праведзена зусім дрэнна і амаль уся ўвага камісіі па чысткі была накіравана на вышукваньне адмоўнага ў паасобных працаўнікоў, дык ўсё-ж некаторым грамадзкім брыгадам удалося выявіць адмоўныя бакі ў апараце наогул. Ускрыт цэлы шэраг выпадкаў скажэньня клясавай лініі па выдачы крэдытаў. Як адзін толькі яскравы прыклад—трэба прывесьці выпадак у Парыцкім раёне, дзе старшыня с.-гасп. таварыства выдаў 600 руб. былому абшарніку, зараз кулаку, абкладаемаму індывідуальным падаткам, а беднота заставалася незадаволенай. Выяўлена, што Парыцкі РВК накладаў адноўкавы штраф за роўныя лесапарубкі і па заможных і на беднякоў; што парсуд прысудзіў да адноўкавага пакараньня і кулака і яго батрака, ўцягнутага ў драку з сялянамі сваім гаспадаром-кулаком. У іншых мясцох пры чысткі апарату выяўлена, што сродкі на бясплатную выдачу лесу беднаце не скарыстаны, што не скарыстаны сродкі на дапамогу вучням-беднякам; не скарыстаны сродкі на каапэраваньне беднаты; што зямля з запаснага фонду перададзена заможным і г. д.

Побач з гэткімі фактамі выяўлены выпадкі цыганіны, як вынік дрэннай арганізацыі працы ў РВК, напрыклад, РВК пасылае сельсавету запрос аб маёмасным становішчы селяніна, у той час, як у самім РВК аб гэтым маюцца даныя па с.-гасп. падатку і па страхоўцы.

Заўважаны выпадкі безгаспадарчасьці, неэканомнай траты сродкаў і г. д. і г. д.

Аб гэткіх выніках варта казаць не таму, што яны ўскрылі ўсе недахопы апарату і даюць нам магчымасьць распрацаваць агульныя мерапрыемствы па паленшаньні працы,—бязумоўна, гэта зрабіць немагчыма, паколькі такіх матар'ялаў пакуль што мала, але гэтыя прыклады паказваюць, па-першае, што ў сапраўднасьці ў шэрагу ўстаноў ёсьць шмат буйных памылак і недахопаў, якіх мы ў штодзённай працы не заўважаем, з прычыны чаго і патрабуецца грунтоўная праверка працы апарату наогул, па-другое, што праверка працы апарату наогул у значнай меры зьяўляецца пасільнай і для грамадзкіх падрыхтоўчых брыгад, калі толькі іх удаецца зацікавіць.

Вынікі чысткі асабістага складу.

Па кожнай акрузе для вопыту была праведзена чыстка ў адным раёне.

Па 7 раёнах (за выключэньнем Полацкай акругі) было праверана ўсяго 1811 служачых раённых і сельскіх устаноў. З гэтага ліку вычышчана па 1-й катэгорыі 66 асоб ці 3,6 проц. усяго складу служачых 7 раёнаў. На 2 і 3 катэгорыі (разам) вычышчана 97 асоб ці 5,4 проц. Калі-ж [illegible] дзець раёны паасобна, дык процант вычышчаных будзе рэзка кідацца ў вочы.

Напрыклад, у Парыцкім раёне Бабруйскае акругі па 1-й катэгорыі вычышчана 6,5 проц. усяго складу служачых раёну, а ў Пухавіцкім раёне Менскай акругі—1,5 проц., у Нараўлянскім раёне Мазырскай акругі—3,1 проц. і г. д. На 2 і 3 катэгорыі ў Пухавіцкім раёне вычышчана 7,3 проц., у Прапойскім р. Магілёўскай акр.—6 проц., а ў Лядзянскім р. Аршанскай акругі—2,7 проц. і г. д.

Увогуле-ж процант зьнятых па трох катэгорыях разам амаль адноўкавы для ўсіх раёнаў — у межах 8—10 проц. і толькі ў Лядзянскім раёне Аршанскай акругі вычышчаныя па трох катэгорыях складаюць 4,7 пр. служачых.

Акруговыя ўстановы ў кожнай акрузе прачышчаны розныя: Статбюро ў 4-х акругах, страхагэнцтвы ў 3-х, Акрза ў 3-х і г. д.

Вынікі чысткі па галінам наступныя:

У Статбюро па 1-й катэгорыі — 9,3 проц., па 2 і 3-й—3 проц.; у аддзяленьнях банкаў—па 1-й – 3,3 пр., па 2 і 3-й—2,5 проц., у Акрстрахах—па 1-й—3 проц., па 2 і 3-й—6,5 проц.; у Акруговых судах і пракуратуры—па 1-й—2,7 проц., па 2 і 3-й—1,6 проц.; у АФА—па 1-й—2 проц., па 2 і 3-й катэгорыі—2 проц.; у АкрЗА—па 1-й катэгорыі—1,8 проц., па 2 і 3-й—4,4 проц.

Па ўсім тром катэгорыям Статбюро даюць найбольшы процант вычышчаных—12,3 проц., потым ідуць Акрстрахі—9,5 проц. і апошняе мейсца займаюць судовыя органы—4,3 проц.

Па цэнтральных установах лічбы такія.

У Цэнтр. Стат. Упр. процант вычышчаных (1 асоба па 3 катэгорыі) складае 0,4 проц. усяго складу служачых. Па Дзяржбанку па 1-й катэгорыі вычышчана 2 проц., а па 2 і 3-й—4 проц.

Па Каапэрацыйным банку па 2 і 3 катэгорыі вычышчана 8 проц., па Камунальным Банку па 1-й катэгорыі—2,5 проц., па 2-й і 3-й катэгорыях таксама 2,5 проц. Па НКЮ па 1-й катэгорыі—4 проц. Па НКЗему—па 1-й катэгор.—4 проц., па 2 і 3-й—7 проц.

(Да гэтых лічбаў трэба зрабіць агаворку, што па Камунбанку, НКЮ і НКЗему не разглядаліся яшчэ апэляцыі вычышчаных).

Паколькі ўся праца па чысткі прызнана нездавальняючай і будзе праведзена паўторная чыстка апарату акруговых і цэнтральных устаноў—ніякіх абгрунтаваных агульных вываадаў з прыведзеных лічбаў рабіць нельга.

Гэта тым больш рызыкова, што на Статбюро, напрыклад, процант вычышчаных самы вялікі, тады як іменна праца Статбюро менш усяго правяралася пры чысткі. Адсюль можна вывесьці толькі такую думку, што наогул служачыя пад чыстку пападалі ня столькі з боку сваёй працы, колькі за іншыя моманты і што матар'ял, на падставе якога яны вычышчаны, менш за ўсё выкрывае памылкі, недахопы, шкодніцтва ў самой працы.

Гэтая думка дадаткова падцьвярджаецца некаторымі лічбамі. Так, напрыклад, у Полацку сярод 74 асоб, зьнятых па чысткі, толькі 42 проц. зьнята за злачынствы па службе, а 58 проц. зьнята па адзнакам сацыяльнага паходжаньня, эканамічнага становішча і дзейнасьці ў мінулым.

У Віцебску, у ліку 23 асоб, зьнятых па 1-й катэгорыі, толькі 5 служачых альбо 22 проц. зьнята па адзнакам шкодніцтва ў працы, а астатнія 78 проц. зьняты па іншым матывам, але не па ацэнцы іх працы ў апараце.

У Магілеве з 25 асоб, зьнятых па 1-й катэгорыі, толькі 8 альбо 32 проц. зьнята за іх шкоднасьць у працы.

Вось чаму можна казаць, што праведзеная чыстка апарату ня можа нас задаволіць, калі мы сваю ўвагу менш за ўсё накіроўваем на выяўленьне сапраўднай фактычнай працы апарату і паасобных служачых, як быццам у гэтым напрамку ў нас усё добра.

Бязумоўна, мы ня можам абыходзіць без увагі і той момант, што ў нашым апараце шмат усялякіх „былых", але калі-б задача чысткі апарату зводзілася пераважна да выяўленьня „былых", дык для гэтага ня трэба было-б затрачваць столькі часу, сродкаў, увагі, бо лягчэй за ўсё ў любой установе знайсьці і зьняць б. гандляроў, ураднікаў, дзяцей папоў, кулакоў і г.д.

Наша сучасная галоўная задача састаіць як раз у тым, каб выявіць недахопы, памылкі, шкодніцтва ў самой працы, зьнішчыць гэтыя моманты, палепшыць працу апарату наогул і на падставе канкрэтных даных ацэнкі працы зрабіць адпаведныя вывады адносна тых служачых, якія гэта заслугоўваюць.

Х. Жукаў.

(Працяг будзе).

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Забясьпечаньне насельніцтва драўнінай і лесаматар'ялам.

Віцебск, 14-XI. Наркамзем вызначыў для Віцебскай акругі лесасечны фонд у 424.270 кубамэтраў драўніны, з гэтай колькасьці будаўнічага лесу 171992 кубамэтры, а астатняя колькасьць на дровы. Насельніцтву вызначана адпусьціць 61117 кубамэтраў будаўнічага лесу і 121426 кубамэтраў дроў.

Уся астатняя колькасьць драўніны перадаецца Лесбелу і Лесзагу для забясьпечаньня прамысловасьці. На Лесбел усклада зена таксама забясьпячэньне лесаматар'ялам і дравамі ўсёй мясцовай прамысловасьці. Усім раёнам дадзены ўказаньні разьмеркава

Накіруем творчасьць мас на выкананьне другога году пяцігодкі.

Рацыяналізуем прамысловасьць на падставе жыцьцёвых патрэб нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Рашучая барацьба з галавацяпствам, безгаспадарчасьцю, папяровай стралянінай у справе будаўніцтва фабрык і заводаў.

БЕЛМЭТАЛЁТРЭСТ, ЗАМЕСТ ПЛЯНАВАНЬНЯ, ДЭЗАРГАНІЗУЕ РАБОТУ ПААСОБНЫХ ЗАВОДАЎ.

Пастанова Эканамічнае Нарады пры СНК БССР

па пытаньню палепшаньня якасьці прадукцыі.

Заслухаўшы даклад Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі аб якасьці прадукцыі прамысловасьці, Эканамічная Нарада канстатуе:

1. Палепшаньне якасьці прадукцыі не дасягнута, а на цэламу шэрагу вытворчасьцяў наглядаецца нават пагоршаньне якасьці, асабліва ў мясцовай і саматужнай прамысловасьці.

2. Асноўнымі недахопамі якасьці прадукцыі, якія наглядаюцца яшчэ ў паасобных відах прамысловасьці, зьяўляюцца:

а) Па папяровай прамысловасьці—недастаткова роўная абрэзка гільзавых бабін, малая моцнасьць пры разрыве, нядобраякасная пакоўка нераўнамернасьць у шчыльнасьці абояў, плямістасьць, нядобраякасная абрэзка, нездавальняючая сартыроўка і праклейка пішчай паперы.

б) Па шкляной прамысловасьці—нездавальняючая шліфоўка лямпавага шкла і нераўнамерная яго грубізна, нядобраякасная сартыроўка шклянак, нездавальняючая апрацоўка прэсованага шкла, значны процант бою ў вытворчасьці.

в) Па лесаматар'ялах—паніжэньне сортнасьці піламатар'ялаў, нездавальняючая сартыроўка і пакоўка фанеры.

г) Па шэйнай прамысловасьці—нядобраякасная апрацоўка фабрыкатаў: дрэнная прышыўка гузікаў, нізкая якасьць апошніх, нездавальняючая аўчыстка зімовай вопратці ад ваты, несуадпаведнасьць асартымэнту да сэзону і да запатрабаваньняў спажыўцоў (разьмер і інш.), нездавальняючая колероўка мехавай гарнітуры, пакоўка.

д) Па запалкавай прамысловасьці—дрэнная аклейка каробак, недастатковае напаўненьне іх запалкамі (менш як 55 дзіўнак), недастатковая прасушка галовак, адхіленьне ад усесаюзных стандартаў.

е) Па скурана-абутковай прамысловасьці—нездавальняючая фарбоўка шаўрэту, дэфэкты ў розных працэсах вытворчасьці (дубленьне, апрацоўка крою і інш.), дрэнная якасьць абутковай прадукцыі (недобраякасная абрабленьне вырабаў, дрэнная аўчыстка цьвікоў, крывыя абсацы і г. д.).

ж) Па галянтарэйным вырабам—нездавальняючая якасьць грэбняў па фасонам, колеру, шліфоўцы, дрэнная абрэбтка скураных галянтарэйных вырабаў (дрэнная пашыўка іх, недобраякасныя замкі і інш.).

3. Асноўнымі прычынамі кепскай якасьці прадукцыі зьяўляюцца:

а) пагоршаньне ў шэрагу выпадкаў якасьці сыравіны (хром для абуткаў, сыравіна для трыкатажных вырабаў і інш.);

б) недахопы, якія маюць месца ў самой вытворчасьці, менавіта недастатковы ўнутры-заводзкі кантроль, недастатковы нагляд за выкананьнем прамысловых стандартаў, слаба разгорнутая сетка фабрычна-заводзкіх лябараторый, няўважлівыя адносіны да добраякасных сартыроўкі і бракоўкі гатовых вырабаў, недастаткова разгорнутыя рацыяналізатарскія мерапрыемствы па падвышэньню якасьці прадукцыі, недастатковае тэхнічнае нармаваньне, імкненьне прадпрыемстваў да колькаснага эфэкту за лік пагоршаньня якасьці і інш.

4. Асабліва трэба падкрэсьліць усё яшчэ слабы ўдзел шырокіх працоўных мас у вытворчасьці (вытворчыя нарады і камісіі) у пытаньнях якасьці прадукцыі, недастатковае асьвятленьне гэтых пытаньняў у друку, як агульным, так і насьпецгазэтах, не разгорнута дастаткова сацыялістычнае спаборніцтва вакол пытаньняў палепшаньня якасьці паасобных вырабаў не прыцягнуты да гэтага часу прапаўнікі прылаўка і інш.

Лічучы пытаньне якасьці прадукцыі пытаньнем першай важнасьці. Эканамічная Нарада, каб дабіцца рашучага пералому ў гэтай галіне, пастанаўляе:

1) Узмацніць унутры-заводзкі кантроль у паасобных стадыях вытворчасьці праз абавязковую арганізацыю ў 1929-30 годзе фабрычна-заводзкіх лябараторый па пляну Вышэйшага Савету Народнай Гаспадаркі і ўстаноўкі кантрольных прыбораў па вызначэньню працы паасобных апаратаў. Патрэбныя сродкі прадугледзіць у прамфінплянах трэстаў на бягучы апэрацыйны год.

2) Праца фабрычна-заводзкіх лабараторый павінна мець ня толькі дасьледчы характар; яна павінна мець сьцісную сувязь з усімі працэсамі вытворчасьці—ад аналізу якасьці вытворчых матар'ялаў, сыравіны і рэцэптуры да дасьледаў правідловага ходу паасобных працэсаў, устанаўленьня прычын браку, угара, бою.

3) Узмацніць працу па складаньню стандартаў паасобных відаў сыравіны і гатовых вырабаў.

Усе ўстаноўленыя ўсесаюзныя стандарты на прадукцыю павінны, бязумоўна, ажыцьцяўляцца з устаноўленага для іх Саветам Працы і Абароны тэрміну; на ўсіх прадпрыемствах павінен быць бесперапынны кантроль на выкананьню ўстаноўленых стандартаў.

4) Прадукцыя, якая выпушчаецца на рынак, павінна мець адзнаку аб яе суадпаведнасьці патрабаваньням стандартаў на падставе папярэдніх аналізаў, абмераў і іншых испытаў.

5) Прапанаваць Белкаапсаюзу і Белрабсэкцыі арганізаваць лябараторна-асартымэнтныя пункты па сыстэматычнаму нагляду за асартымэнтам спажывецкіх тавараў—пры БКС, Віцебскім і Гомельскім саюзах спажывецкіх таварыстваў з удзелам адпаведных ЦРК у гэтай працы.

6) Увесьці ў паасобных галінах прамысловасьці дакладную бракоўку наўфабрыкатаў, не дапушчаючы далейшай апрацоўкі іх, пад асабістую адказвасьць бракоўшчыкаў; увесьці на прадпрыемствах бракоўку канчатковых вырабаў, удасканаліць сартыроўку і прыёмку іх, узмацніўшы адказнасьць за невыкананьне гэтых абавязкаў.

7) На прадпрыёмствах павінны быць неадкладна распрацаваны мерапрыемствы па ўпарадкаваньню складзкай гаспадаркі і ўнутры заводзкага транспарту ў сэнсе стварэньня ўмоў для належнага хаваньня сыравіны, матар'ялаў і гатовых вырабаў (забясьпечыць іх ад вільготнасьці, загразьненьня) і падачы ў паасобныя вытворчыя працэсы.

8) Скасаваць шматлікавасьць форм тары, устанавіць мясцовыя (заводзка-трэстаўскія) стандарты тары і пакоўкі з пункту погляду захаваньня вырабаў ад псаваньня і рацыяналізацыі гэтай справы наогул.

9) У прамфінплянах прадпрыемстваў прадугледзець паасобна тыя рацыяналізатарскія мерапрыемствы, якія могуць прывесьці да палепшаньня якасьці прадукцыі (устаноўка тых ці іншых апаратаў, зьмяненьне тэхналёгічных працэсаў, набыцьцё адпаведнага інструмэнтарыя, спэцыялізацыя прадпрыемстваў і г. д.).

10) Практыкаваць на ўсіх прадпрыемствах выстаўку ўзораў бракованых вырабаў з паказаньнем прычын браку і мерапрыемстваў да іх адхіленьня.

11) Даручыць БКС і Белрабсэкцыі распрацаваць у 2-хмесячны тэрмін пытаньне аб мэт згодніасьці арганізацыі ў Менску гандлёвага музэю.

12) Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі і НК Гандлю пераглядзець прэйскуранты на паасобныя вырабы для ўстанаўленьня розных цэн на прадукцыю рознай якасьці.

13) Абавязаць вытворчыя арганізацыі рэспубліканскай, мясцовай і саматужнай прамысловасьці пасіліць удзел каапэрацыі ў распрацоўцы вытворчых праграм у мэтах прыстасаваньня асартымэнту (разьмеру, фасону і інш.) вырабаў да фактычнага патрабаваньня рынку.

14) Вышэйшаму Савету Народнае Гаспадаркі правесьці ў жыцьцё мерапрыемствы па падвышэньню кваліфікацыі рабочых і пашырэньню на прадпрыёмствах вытворчай прапаганды; да ўдзелу ў апошняй справе прыцягнуць калектывы інжынэрна-тэхнічных сіл праз іх прафсаюзныя арганізацыі.

15) Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі з удзелам ЦСПСБ арганізаваць на працягу бліжэйшага месяца на найбольш буйных і характарных прадпрыемствах часовыя кантрольныя камісіі па спэцыяльнаму вывучэньню пытаньняў якасьці прадукцыі з наступным абгаварэньнем вынікаў іх працы на шырокіх сходах рабочых.

16) Узмацніць удзел шырокіх рабочых мас у справе палепшаньня якасьці прадукцыі, практыкаваць абавязкова пэрыядычныя справаздачы дырэктароў паасобных прадпрыемстваў на вытворчых нарадах аб становішчы якасьці прадукцыі і садакладзе сяброў вытворчых і часова-кантрольных камісій і інжынэрна-тэхнічнай сэкцыі.

17) У заключаемых дагаворах сацыялістычнага спаборніцтва, у тым ліку і ў дагаворах паміж паасобнымі рабочымі ставіць спэцыяльныя пункты, якія датычаць якасьці прадукцыі і якія характарызуюць дэталёва абавязкі кожнага рабочага паасобна.

18) Пры заключэньні калектыўных дагавораў прадугледзіць мерапрыемствы да зьмяншэньня колькасьці браку, а таксама і кантроль за выкананьнем гэтых мерапрыёмстваў.

19) Узмацніць ролю насьценных газэт і агульнага друку ў справе барацьбы за палепшаньне якасьці прадукцыі.

20) Практыкаваць скліканьне пэрыядычных нарад прадпрыемстваў, каапэрацыйных арганізацый і актыву рабочых па пытаньням якасьці прадукцыі, а таксама вечары сустрэчы рабочых з спажыўцамі.

21) БКС і Белрабсэкцыі з удзелам ЦСПСБ распрацаваць мэтады ўцягненьня працаўнікоў прылаўку ў справу барацьбы за палепшаньне якасьці прадукцыі.

22) У мэтах выкананьня гэтай пастановы даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі ў 2-х тыднёвы тэрмін даць адпаведныя дырэктывы на месцы па лініі як рэспубліканскай, так і мясцовай прамысловасьці.

23) Прапанаваць НКГандлю ў месячны тэрмін распрацаваць пытаньне аб крымінальнай адказнасьці за выпуск з прамысловых прадпрыёмстваў яўна недобраякаснай прадукцыі і праэкт адпаведнага закону ўнесьці ў СНК.

СТАРШЫНЯ ЭКАНАМІЧНАЕ НАРАДЫ ПРЫ СНК БССР М. Карклін.

КІРАЎНІК СПРАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ І ЭКАНАМІЧНАЕ НАРАДЫ БССР М. Калевіч.

12 лістапада, 1929 г., г. Менск

Да пабудовы агра-індустрыяльных камбінатаў у БССР.

3-га лістапада г. г. пад старшынствам т. Рачыцкага адбылася другая нарада па арганізацыі агра-індустрыяльнага камбінату ў БССР.

Нарада прызнала неабходным арганізаваць у БССР два агра-індустрыяльных камбінаты: бульба-жывотнаводчы і ільна-малочны.

Для арганізацыі бульба-жывотнаводчага камбінату лепшым месцам зьяўляецца Рагачэўска-Жлобінскі раён.

Пытаньне аб выбары раёну для арганізацыі ільнаводна-малочнага камбінату ў Віцебскай ці Аршанскай акрузе—яшчэ патрабуе далейшага вывучэньня гэтых округ.

У тэрміновым парадку ўнесьці пытаньне аб арганізацыі агра-індустрыяльных камбінатаў у Дзяржплян для далейшай прапрацоўкі і прадстаўленьня ўладзе на канчатковае рашэньне.

Нарада лічыць, што пабудова памянёных агра-індустрыяльных камбінатаў зьяўляецца пачаткам арганізацыі ў рэспубліцы сплашной сеткай агра-індустрыяльных калгасаў.

У мэтах правільнага разьмяшчэньня гэтых камбінатаў тэрмінова прыступіць к гаспадарчаму раёнараваньню рэспублікі, стварыўшы для гэтага спэцыяльную рабочую камісію пры Дзяржпляне БССР.

Тэрмін працы гэтай камісіі павінен быць ня больш шасьці месяцаў.

Нарада лічыць неабходным пераглядзець рэспубліканскі плян па індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі на 1929-30 год, зьвязаўшы яго з будаўніцтвам агра-індустрыяльных камбінатаў. Нарада пастанавіла запатрабаваць ад зацікаўленых округ (Бабруйскай, Віцебскай і Аршанскай) усе матар'ялы па эканамічнаму заснаваньню будаўніцтва агра-індустрыяльных камбінатаў.

Таксама нарада прызнала неабходным склікаць у бліжэйшым зьезд працаўнікоў па індустрыялізацыі сельскай гаспадаркі, уключыўшы ў парадак дня пытаньне аб будаўніцтве агра-індустрыяльных камбінатаў.

ДА ПЫТАНЬНЯ АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

Заўсёды, калі ў нас гавораць аб прамысловасьці, маюць у думках толькі прамысловасьць рэспубліканскую, мясцовая прамысловасьць, якая за апошні час займае досыць значнае месца і наогул прамысловасьць іншых наркаматаў і арганізацый зусім не бярэцца пад увагу.

Ва ўмовах БССР уся прамысловасьць у большай сваёй частцы зьяўляецца дробнай, а пагэтаму неабходна пры разглядзе пытаньня аб рэарганізацыі прамысловасьці ўлічваць і гэтую акалічнасьць.

Вядома, што наогул прамысловасьць БССР значна адрозьніваецца ад прамысловасьці іншых рэспублік Саюзу і, улічваючы яе асаблівасьці (адсутнасьць цяжкай індустрыі, разьвіцьцё адных і тых-жа галін прамысловасьці), неабходна пры рэарганізацыі мець гэта на ўвазе і распрацаваць гэтае пытаньне з пункту погляду ўсёй прамысловасьці БССР, нягледзячы ў якім камісарыяце, арганізацыі (НКЗ, Белсельтрэст, калгасы, Белсампрамсаюз, БСІКО, НК Аховы Здароўя і г. д.) гэтыя прамысловыя прадпрыёмствы знаходзяцца; гэтае пытаньне павінна стаць пытаньнем ня толькі ВСНГ—да справы рэарганізацыі прамысловасьці ва ўмовах БССР неабходна прыцягнуць усе наркаматы, маючыя прамысловыя прадпрыемствы, а таксама вакол гэтага пытаньня павінна быць мабілізавана ўвага шырокай грамадзкасьці.

У сучасны момант мы маем, што адны і тыя-ж прадпрыёмствы разьвіваюцца ў розных наркаматах, арганізацыях і ўстановах; напрыклад, харчсмакавая прамысловасьць: у рэспубліканскай прамысловасьці ВСНГ, мясцовай АВК, НКЗ, (Белсельтрэст, калгасы), НКГ, Белкаапсаюз, Белсампрамсаюз, БСІКА, НКП і г. д., таксама хімічныя, дрэваапрацоўчыя і інш. прамысловасьці. Гэткае разьвіцьцё (а яно ў значнай частцы не ўвязваецца паміж сабой) прыводзіць часта да таго, што гэтыя прадпрыёмствы растуць без папярэдняга ўліку як маючыхся сыравінных рэсурсаў, так і рынкаў збыту, што ў іншых выпадках прыводзіць, на жаль, да сумных вынікаў.

Далейшае разьвіцьцё прамысловасьці гэткім шляхам немагчыма, асабліва ўлічваючы тое тэмп разьвіцьця прамысловасьці, запрэактываны пяцігодкай і кантрольнымі лічбамі на 29-30 год.

На далейшы час кіраваньне і плянаваньне прамысловасьці павінна быць так пастаўлена, каб пры найменшай затраце матэрыяльных сродкаў больш эканамічна скарыстаньні тэхнічна-эканамічных сіл, магчыма было-б даць больш значны эфэкт яе.

Як трэба рэарганізаваць прамысловасьць БССР для таго, каб зьліквідаваць маючыяся недахопы ў плянаваньні галін прамысловасьці, як у пытаньнях капітальнага будаўніцтва, забясьпечаньня сыравінай і збыту ў той ці іншай галіне прамысловасьці, у сучасны момант рэсканда на адзіным наркаматам, арганізацыям, таксама і па пытаньню забясьпечаньня тэхнічна-эканамічным пэрсаналам (што ў сучасны момант таксама зьяўляецца вельмі вострым) гэтыя прадпрыёмствы?

Для ажыцьцяўленьня гэтага ёсьць два варыянты: 1) неабходна будзе пераглядзець усе маючыяся прамысловыя прадпрыемствы ў БССР па ўсім наркаматам, арганізацыям, установам і ВСНГ БССР. Дзякуючы адбору прадпрыемстваў па адзіным галінам прамысловасьці ад усіх наркаматаў, арганізацый і ўстаноў і пы згрупаваньні іх у адны рукі, зьвяцца магчымасьць тады арганізаваць моцныя і досыць буйныя галінавыя трэсты ў БССР (напрыклад, сканцэнтраваць усе бровары, крухмальна-патачныя, цагэльныя заводы і г. д.), якія павінны быць падпарадкаваны ВСНГ БССР, а з астатніх менш буйных прадпрыемстваў неабходна будзе згрупаваць акруговыя трэсты мясцовай прамысловосьці пад непасрэдным кіраваньнем АВК (Інспэкцыя мясцовай прамысловасьці); прычым гэтыя трэсты павінны групавацца па свайму геаграфічнаму разьмяшчэньню, і выходзячы з эканомікі таго ці іншага раёну, базіруючыся амаль выключна на сыравінных рэсурсах округі, што дасьць магчымасьць больш упаўнена грунтаваць іх работу.

Што-ж датычыцца каапэрацыйнага сэктару па мясцовай прамысловасьці (Белсампрамсаюз, БСІКА і г. д), дык ён пасьля перадачы сваіх буйных прадпрыемстваў дзяржаўнай прамысловасьці і папаўненьнем іх прадпрыемствамі працаляктываў і зьлізьне БСІКА з Белсампрамсаюзам (што неабходна будзе таксама правесьці), будзе мець больш аднародныя, як на колькасьці занятых рабочых, так і ў галінавым разрэзу прадпрыемствы.

Плянаваньне і кіраваньне будуць ажыцьцяўлены з боку ВСНГ БССР па прамысловасьці дзяржаўнай і каапэрацыйнаму сэктару праз узмацнёныя галінавыя групы ВСНГ і Самкамітэтам БССР (які павінен быць створан замест існуючай групы мясцовай прамысловасьці), а ў АВК праз інспэкцыю мясцовай прамысловасьці.

Гэта ёсьць адзін варыянт, а другі—пакінуць за ВСНГ выключна тэхнічна-эканамічнае кіраваньне як дзяржаўнага, так і каапэрацыйнага, а таксама і прыватнага сэктару прамысловасьці, шляхам арганізацыі НТУ і Самкамітэту, пакінуўшы пры ВСНГ выключна моцныя галінавыя трэсты, а ўсе астатнія прадпрыемствы групаваць па іх эканамічнаму райёнаваньню ў АВК праз ОСНГ, якой будзе плянаваць і кіраваць як дзяржаўным, каапэрацыйным, так і прыватным сэктарамі прамысловасьці, а агульны напрамак кіраваньня ў плянаваньні яны будуць атрымліваць ад ВСНГ БССР і тады будзе у округах сапраўднае кіраўніцтва ўсімі прамысловымі прадпрыемствамі округі шляхам групаваньня галінавых трэстаў.

Другі варыянт дасьць магчымасьць з аднаго боку больш жыцьцёва аб'яднаць сувязь мясцовага бюджэту з прамысловасьцю, і гэтым самым дасьць магчымасьць узмацніць мясцовы бюджэт, а таксама наблізіць месцы да сапраўднага кіраваньня прамысловасьцю, а з другога—ахапіць плянаваньне прамысловасьці акругі па ўсім галінам і зьвеньням (ціпер кожнае зьвяно па свайму плянуе), і тады ня будуць наглядацца такія адмоўныя зьявішчы, калі ў аднэй і тэй жа акрузе розныя наркаматы і арганізацыі будуюць па аднэй і тэй жа галіне аднолькавыя прадпрыёмствы. Гэтым самым мы ажыцьцявім асноўную праблему—**роля месц у кіраваньні прамысловасьці.**

Трэба адзначыць, што ВСНГ СССР таксама ў сваіх тэзісах па рэарганізацыі прамысловасьці амаль зусім праходзіць міма гэтай асноўнай праблемы і ў іх усё вельмі цэнтралізавана.

Пры разглядзе пытаньня аб рэарганізацыі кіраўніцтва прамысловасьці на аб'яднаным пасяджэньні СНК РСФСР і ЭКАНА т. Лобаў падкрэсьлівае на неабходнасьць узмацненьня **ролі мясцовых органаў у кіраваньні прамысловасьці**, і ў асноўным Савет Народных Камісараў РСФСР ухваліў прапазіцыі тав. Лобава („Известия" № 253-3789 ад 1-XI—1929 г.).

Вядома, што нам у БССР пры выбару тых ці іншых форм кіраваньня прамысловасьці неабходна ўлічваць маючыяся асаблівыя ўмовы ў прамысловасьці БССР і, выходзячы з гэтых асаблівасьцяў, ажыцьцяўляць рэарганізацыю і кіраўніцтва прамысловасьці БССР, але адно трэба памятаваць, што перагляд арганізацыйных форм і кіраваньне прамысловасьці ў БССР, улічваючы асаблівасьці, неабходна разглядваць ня толькі прамысловасьць ВСНГ і АВК, а ўсіх наркаматаў, арганізацый і ўстаноў. Сапраўды, гэта работа вельмі вялікая, але затое яна пры добрай перапрацоўцы яе сумесна з шырокай грамадзкасьцю і ўсімі зацікаўленымі наркаматамі і арганізацыямі дасьць і добрыя вынікі.

Л. Д. Сьляпян.

НЕ КІРАЎНІЦТВА, А ГАЛАВАЦЯПСТВА

КІРАЎНІК ЗАВОДУ МЭТАЛЁТРЭСТУ „ДАПАМАГАЕ".

Год з лішнім таму назад, паводле пастаноў кіруючых гаспадарчых органаў, прадпрыемствы „Мэталь", „Усход" і «Сельска-гаспадарчыя майстэрні» імя Бурбіса былі аб'яднаны ў адно прадпрыемства пад назвай машына-будаўнічы завод «Камунар». Вынікі першага году работы заводу „Камунар" сьведчаць аб тым, што такое мерапрыёмства было зусім мэтазгодным і своечасовым, у выніку якога „Камунар" зараз разьвіваецца ў буйнейшую машына-будаўнічую адзінку. На заводзе зараз працуе каля 700 рабочых. Здавалася-б, што зараз, у пэрыяд узмоцненага тэмпу індустрыялізацыі краіны, плянавае разьвіцьцё заводу павінна карыстацца ўсямерным падтрыманьнем з боку нашых кіруючых арганізацый. Што-ж мы бачым на самай справе?

На вялікі жаль прыходзіцца канстатаваць, што нашы гаспадарчыя арганізацыі ня толькі не падтрымліваюць завод „Камунар", а нават сваімі адносінамі да заводу перашкаджаюць яго рабоце. Як ня дзіўна, але прыходзіцца сказаць, што непасрэдны кіраўнік заводу, Белмэталётрэст, усімі спосабамі перашкаджаў рабоце заводу, дэзарганізоўваў яго плянамернае і паступовае разьвіцьцё. Дзесяткі фактаў нам сьведчаць аб гэтым.

„УЗДЫМАЮЦЬ" ТЭХНІКУ ЗАВОДУ.

Наколькі кіраўніцтва Белмэталётрэсту разыходзіцца з сапраўднымі патрэбамі заводу, сьведчаць тыя нерэальныя плыны капітальнага будаўніцтва заводу, дробнага яго абсталяваньня. Каб падкрэсьліць гэта, можна спыніцца на пабудове фабрыкі бляшаных вырабаў. Для пабудовы гэтай фабрыкі трэст вызначыў толькі 150 тысяч руб., у той час, калі пабудова іншых аналёгічных фабрык каштуе ў 2-3 разы больш. Бязумоўна, гэта будзе ня фабрыка, а саматужная майстэрня, якая па сваёй прадукцыі ніколі не задаволіць патрэбаў рынкаў. Пра абсталяваньне фабрыкі, паводле патрабаваньняў навейшых тэхнічных дасягненьняў і гаварыць ня прыходзіцца.

Цікава спыніцца на тым, як Белмэталётрэст забясьпечыў завод „Камунар" абсталяваньнем. На 1929-30 гаспадарчы год завод падручыўся выканаць досыць вялікую вытворчую праграму. Але для гэтага завод яшчэ ня мае патрэбнага абсталяваньня. Заводакіраўніцтва склала на абсталяваньне заяўку, якая была праработана ў вытворчай камісіі, вытворчай нарадзе і накіравана ў Белмэталётрэст. Замест таго, каб грунтуючыся на рэальных патрэбах заводу, заяўку гэту выканаць і гэтым самым дамагчы выканаць вытворчую праграму, Белмэталётрэст аднёсься да заяўкі заводу па бюракратычнаму. Трэст заяўку заводу згубіў. Для таго, каб ўсё-ж такі пасьля мець апраўданьне, трэст патурбаваўся склаць сам заяўку, пры тым такую, якая зусім не адпавядала патрэбам заводу. Урэшце выявілася, што ў трэстаўскую заяўку было ўключана і тое абсталяваньне, якое трэба было даць заводу на 4-ты квартал на 1928-29 год, патрэба ў якім ужо мінула, у сувязі са зьменаю вытворчай праграмы на 1929-30 гаспадарчы год. Такія адносіны з боку трэсту да заводу гавораць аб тым, што апарат трэсту хварэе бюракратычнай хваробай. Трэба сказаць, што ў справе забясьпячэньня заводу абсталяваньнем трэст меў сваю да канца прадуманую сыстэму, накіраваную на зрыў усіх мерапрыёмстваў заводу. Заводу былі патрэбны такарна-вінтарэзныя варштаты і калі завод зьвярнуўся з просьбай у трэст заказаць гэтакія на іншых заводах, то трэст адказаў, што два варштаты, якія прызначаны для новага Гомельскага заводу, перадаюцца заводу „Камунар". Трэст, нават, напісаў аб гэтым адносіну ва Ўсесаюзны мэталёсындыкат, адбітак якой і накіраваў заводу «Камунар". Абяцанага тры гады чакаем. Завод усё-ж такі ня выцярпеў і пачаў дабівацца свайго, то высьветлілася, што трэст самым бяссорамным чынам пайшоў на ашуканства. Накіраваўшы заводу копію заказу, трэст арыгіналу заказу ва УсеМТС перасылаць і ня думаў. Двух варштатаў завод так і не атрымаў, а прымушаны быў набываць варштаты не ў парадку заказу, а выпадкова, якія зусім ня прыстасаваны да ўмоў нашай работы. У выніку гэтага варштаты прыходзілася ўкарачаць амаль на 75 проц., у той час, калі на другіх заводах гэтыя варштаты можна было скарыстаць на ўсе 100 проц. Калі-ж у адрас заводу прыбыў новы варштат для халоднай апрацоўкі мэталю, то трэст ня толькі не дапамог заводу атрымаць варштат, а, нават, пастараўся перахапіць яго і накіраваць на другі завод.

ТРЭСТ „НАЛАДЖВАЕ" ЎЗАЕМААДНОСІНЫ.

Побач з гэтым, неабходна спыніцца на тым, як трэст „наладжвае" ўзаемаадносіны між асобнымі заводамі, у прыватнасьці між заводам „Камунар" і заводам «Энэргія». Завод „Камунар" прыняў ад Віцебскай гарбарні заказ на каленчаты вал. Паколькі мадэль і вал былі на заводзе «Энэргія", то скуртрэст падручыўся дагаварыцца і ўзяць гэтыя неабходныя рэчы на «Энэргіі» і аддаць „Камунару" для ўзору. Белмэталётрэст стварыў такія ўмовы, што „Энэргія" ні ў якім разе не давала згоды даць „Камунару" мадэлі і вал, заказ скуртрэсту быў пад пагрозай зрыву. Прышлося зрабіць моцны націск на „Энэргію" праз ВСНГБ і толькі тады было вырашана „спрэчнае" пытаньне. Гэта дыскрэдытавала завод у вачох заказчыкаў і ўсяе пралетарскае грамадзкасьці. Калі было пастаўлена пытаньне аб перадачы некалькі варштатаў і паравога катла з заводу „Энэргія" на завод „Камунар", то «Энэргія», атрымаўшы санкцыю ад Белмэталётрэсту, пастаралася варштаты канчаткова папсаваць, а паравы кацёл прадаць другому заводу. Што гэта значыць? Галавацяпства, ці што-небудзь горшае. Нам думаецца, што псаваць варштаты толькі таму, каб яны ня былі скарыстаны другім заводам, завецца шкодніцтвам, ці, нават, контррэвалюцыяй.

Ці варта спыняцца на тым, што трэст увесь час зрываў на заводзе „Камунар" сацыялістычнае спаборніцтва, не даючы належнай колькасьці заказаў. Хіба гэта кіраўніцтва, калі другія заводы задыхаліся ад заказаў, а завод «Камунар» ставіў пытаньне аб скарачэньні 50 кваліфікаваных сьлесароў.

Усё гэта разам узятае сьведчыць аб адным, што Белмэталётрэст у адносінах да заводу «Камунар» мае выразную палітыку, палітыку зрыву ўсіх мерапрыёмстваў заводу. Трэба раз назаўсёды палажыць гэтаму канец. Апошнія слова з ВСНГБ і ЦКК-РСІ.

Ведаючы.

Безгаспадарчасьць у савгасах Менсельпрому

Ні адзін з савгасаў ня выканаў аграмінімуму.—Авёс прарос у скірдах савгасу „Тиволи". Пладовы пітомнік у савгасе „Людамант" вядзецца барбарскім спосабам.—Пабудавалі двухпавярховую абору ў савгасе „Весялоўка". Для кароў прызначан другі паверх аборы.—Меркавалі пабудаваць паравое „отопление" у аборы.

Менсельпром мае навакол Менску, калі мы ня мыляемся, цэлых пяць савгасаў. Прыгародныя савгасы Менсельпрому павінны былі-б мець высока інтэнсыўную форму гаспадаркі: гароднінства, садоўніцтва і малочную гаспадарку, бо рынак збыту—горад, калі так можна сказаць, знаходзіцца пад носам. Калі да гэтага дадаць неабходнасьць палепшаньня забясьпечаньня рабочых і наогул працоўнага насельніцтва Менску гароднінай, малочнымі прадуктамі, дык стане зусім зразумелым, што Менсельпром павінен быў-бы даўно падумаць аб рэарганізацыі гаспадарак сваіх савгасаў.

На практыцы ж у Менсельпрому ў прыгародных савгасах гаспадарка вядзецца так, як у якім небудзь Бягомльскім, Плешчаніцкім і іншых далёкіх ад рынкаў збыту раёнах. Досыць сказаць, што сёлета пад гароднімі культурамі ў Менсельпрому было занята толькі 16 гэктараў з агульнай плошчы каля 600 гэкт., а рэшта была пад зернавымі і іншымі культурамі.

Сказанае ўжо досыць яскрава сьведчыць аб тым, якія нашы Менсельпромаўцы гаспадарнікі, але аб гаспадарчасьці ў савгасах Менсельпрому мы зьбіраемся спыніцца крыху падрабязьней. Мы добра ня ведаем—ці заглядвалі калі небудзь кіраўнікі Менсельпрому ў свае савгасы, а калі заглядвалі, дык ці зварачвалі яны ўвагу на культурнае вядзеньне апошнімі гаспадарак. Мы кажам, што гэта нам невядома, а таму бярэм на сябе сьмеласьць запрасіць таварышоў з Менсельпрому зрабіць невялічкую прагулку па савгасах.

Дазвольце пачаць беглы агляд з савгасу „Тиволи".

Здымаюць 2 ураджаі аўсу ў год...

Вас, таварыш, чытач дзівіць такое дасягненьне ў галіне сельскай гаспадаркі? Вы кажаце, што аб такіх посьпехах трэба крычаць на ўсю БССР і нават больш.

Так, нас таксама вельмі зьдзівіла, калі на палёх гэтага савгасу мы забачылі вялізарныя скірды, складзеныя ў выглядзе ні то вярблюда, ні то пейкіх невялічкіх гор з далінамі.

Падыходзім бліжэй, аказваецца гэта ў такія скірды складзен гаспадарамі савгасу авёс. Падходзім яшчэ бліжэй,—бачым цэлае цуда... Авес у скірдзе прарос і даў расткі ў 10-12 і больш сантымэтраў, нават больш таго—малады авёс зьбіраецца каласіцца. Вось вам і новая сыстэма Менсельпрому па зьняцьцю двух ураджаяў у адзін год.

У выніках такой сыстэмы авёс прарос, папрэў і адным чынам ураджай амаль загінуў. Прыблізна ў такіх-жа скірдах ляжала і жыта, можа ў крыху лепшых умовах.

Асабліва яшчэ падабаліся нам у гэтым савгасе цяляты,—бегаюць такія прыгожанькія... Ногі тонкія, шыя як саломінка, а бруха, як пузыр... Так адразу і кідаецца ў вочы, што цяляты гадуюцца, як у глухіх цёмных вёсках у яшчэ мала культурных сяльн.

Адным словам „культурнасьць" і „гаспадарчасьць" у савгасе кідаецца ў вочы амаль на кожным кроку.

«Культурны» пладовы пітомнік у Людаманце.

Ёсьць у Менсельпрому савгас „Людамант", а ў савгасе тым—пладовы пітомнік.

Гэты пітомнік, як кажуць, быў закладзен у 1925 ці 1926 годзе. Вядзецца гэты пітомнік, далікатна кажучы, самым безабразным чынам.

???!!!

Вас дзівіць, таварышы з Менсельпрому, такая эцэнка вашай культурнай гаспадаркі?

Можна было-б даць мацнейшую эцэначку, дык, спадзяемся, што вашу пладовую гаспадарку і яе гаспадароў эцэняць адпаведным арыкулам крымінальнага кодэксу органы пракуратуры.

Вам патрэбны факты? Калі ласка.

У 1928 годзе было заакуліравана 48000 дзічкоў, з якіх прыняліся толькі ня 10 проц. Між тым, як кажуць спэцыялісты, павінна было прыняцца мінімум 90 проц., зразумела, пры гаспадарчай пастаноўцы працы.

Тэхніка вырашчываньня пладовых дзеразцоў самая барбарская...

??!!

Так, так, самая барбарская. Нават цёмны селянін у сваім садзе сучкі абрэзвае ножніцамі або нажом, а ў пітомніку савгасу „Людамант" яны, замест нажа, абламваюцца проста... рукамі...

Можам яшчэ крыху дадаць аб гаспадарчасьці ў „Людаманце". Рыхленьне глебы і полка сарняку ў пладовым пітомніку праводзілася сёлета толькі тады, калі дрэўцаў ня было відаць, правільней кажучы, калі яны хаваліся ў сорнай траве.

У выніках такога „культурнага" вядзеньня пладовага пітомніку, апошні страціў усяляку каштоўнасьць. Кажуць, што ў вашым пітомніку не знайшлося амаль ніводнага больш-менш правільна вырашчанага дрэўца. Сапраўды, чым не безабразная пастаноўка працы. Да гэтага трэба дадаць, што Менсельпром да сучаснага моманту не знайшоў часу вырашыць пытаньне аб тыпе прыгароднага саду, дагэтуль няма падбору адпаведнага асартымэнту парод фруктавых дрэў, а садзяць усё тое, што попадаецца пад руку.

Ці Мітрэфанушкі, ці галавацяпы?

Такое пытаньне паўстае, калі пападаеш у Менсельпромаўскі савгас „Весялоўка" і наглядзіш на толькі што пабудаваны 2-х павярховы (?!) скотны двор, які, здаецца, каштаваў Менсельпрому каля 15.000 рублёў.

Аўтар ідэі пабудовы такога скотнага двара, відавочна, жадаў ня толькі дагнаць, але і перагнаць Амэрыку. Як мы ўжо зазначылі, скотны двор двухпавярховы, прычым другі паверх прызначан для жывёлы, а першы—для хаваньня карняплодаў. Папершае, пры такіх умовах хаваньня карняплоды, бязумоўна, будуць псавацца, а падругое—такая „конструкцыя" значна ўдаражыла кошт рабудовы.

Наколькі мы ведаем, карняплоды ўсюды ў СССР, а спэцыялісты кажуць, што і ў Амэрыцы, хаваюцца ў капцах. Чаму ў савгасе „Весялоўка" для карняплодаў пабудован спэцыяльны першы паверх—можна толькі рабіць дагадкі. Калі прыглядаешся да г

У Савеце Народных Камісараў БССР

На апошнім чарговым пасяджэньні Савету Народных Камісараў, якое адбылося пад старшынствам тав. М. М. КАРКЛІНА, былі разгледжаны наступныя пытаньні.

ПРА БУДАЎНІЦТВА 2-Й ДЗЯРЖАЎНАЙ РАЁННАЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ Ў БССР.

СНК заслухаў даклад ВСНГ і салаклад Дзяржпляну наконт будаўніцтва 2-й дзяржаўнай раённай электрычнай станцыі ў БССР. СНК згадзіўся з прапановаю ВСНГ і Гомельскага АВК аб пабудове 2-й раённай электрастанцыі ў раёне вёскі Волатава, Гомельскае акругі. СНК прызнаў правільным уключэньне ў першую чаргу абслугоўваньня ўсіх магчымых спажыўцоў энэргіі гарадоў: Гомеля, Рэчыцы, Жлобіна, Рагачова, Лоева і Добруша з прылягаючымі раёнамі на тэрыторыі БССР і гарадоў: Злынка, Навазыбкаў, і клінцы за межамі БССР.

Магутнасьць 2-й раённай электрастанцыі для першай чаргі зацьверджана арыентыровачна ў 36 тыс. клт. Каштоўнасьць будаўніцтва гэтай станцыі прынята арыентыровачна ў суме 25 млн. руб.

ВСНГ запрапанавана працягваць працу па вывучэньню далейшых спажыўноў электраэнэргіі, зараз-жа распачаць складаньне праэкту станцыі і торпазавозу з такім разьлікам, каб станцыя была пушчана не пазьней пачатку 1932 33 г.

ПРА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ЗАКОНУ АБ РЭАРГАНІЗАЦЫІ ВІЦЕБСКАЙ АКРУГІ У ВОПЫТНА-ПАКАЗАЛЬНУЮ.

СНК заслухаў інфармацыю Народнага Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі аб ходзе работы па ажыцьцяўленьні закону пра рэарганізацыю Віцебскай акругі ў вопытна-паказальную.

Дакладчык адзначыў, што справа рэарганізацыі праходзіць досыць марудна. Тлумачыцца гэта, галоўным чынам, недахопам кваліфікаваных працаўнікоў, недахопаў спэцыялістаў па розных галінах працы. З боку паасобных наркаматаў недастаткова зьвяртаецца ўвагі на ўзмацненьне працы па іх галіне ў рэарганізаванай акрузе.

Дакладчык зазначыў па неабходнасьць зьмяненьня мэтаду інструктажу і кіраўніцтва з боку наркаматаў і цэнтральных устаноў у сэнсе ўзмацненьня жывога інструктаваньня праз выезды наркомаў або намесьнікаў на месцы.

Выступаўшыя ў спрэчках члены СНК таксама падкрэсьлівалі неабходнасьць узмацніць жывое інструктаваньне з боку наркаматаў у працы рэарганізаванай Віцебскай акругі, узмацненьня гэтай акругі кадрамі спэцыялістаў і кваліфікаваных працаўнікоў і г. д.

СНК прызнаў неабходным узмацніць у бліжэйшы час жывое інструктаваньне і праверку з боку цэнтральных устаноў і наркаматаў работы сваіх низавых органаў у Віцебскай акрузе. Адначасна Народным Камісарам і Кіраўніком цэнтральных устаноў запрапанавана выехаць, на працягу 2-х дэкад, у Віцебскую акругу самім, або намесьнікам, для праверкі на месцы, як праходзіць рэарганізацыя сыстэмы кіраўніцтва і сама праца ў Віцебскай акрузе.

ПРА САЦЫЯЛЬНАЕ СТРАХАВАНЬНЕ НА 1929-30 Г.

СНК разглядзеў і зацьвердзіў пададзены Галоўсацстрахам плян і бюджэт сацыяльнага страхаваньня на 1929-30 г.

Усяго на сацыяльнае страхаваньне плянам прадугледжваецца выдаткаваць 21.389,8 тыс. руб., што ў параўнаньні з мінулым годам дае павялічэньне на 17,1 проц. На забясьпечаньне пэнсій інвалідаў намячаецца выдаткаваць 4086,9 тыс. руб., або на 23 проц. больш, як у мінулым годзе. На забясьпечаньне 800 чал. састарэлых рабочых пэнсіяй, намячаецца выдаткаваць 4500,4 тыс, руб. На працоўную дапамогу беспрацоўным намечаны выдатак у 500 тыс. руб., на кваліфікацыю і перакваліфікацыю беспрацоўных—100 тыс. руб., а па ўсіх відах дапамогі беспрацоўным—2,028,2 тыс. руб.

Праз зімнія дамы адпачынку мяркуецца прапусьціць 2400 чал., праз летнія дамы адпачынку—7430 чал., праз санаторыю „Дзесяцігодзьдзе БССР"—1090 чалавек, заарэндаваць 300 месц на курортах СССР.

На новае будаўніцтва, капітальныя рамонты і абсталяваньне намячаецца 688 тыс. руб.

У зьвязку з пераходам прадпрыемстваў і ўстаноў на бесперапынны рабочы тыдзень, Галоўсацстраху даручана спрасьціць парадак выдачы страхкасамі дапамогі, прыблізіўшы гэтую работу да прадпрыемстваў.

ПРА ПАДРЫХТОЎКУ ТЭХНІКАЎ ДЛЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ БССР.

СНК прызнаў неабходным адчыніць на працягу 1930-31-32-33 г. г. наступныя індустрыяльныя тэхнікумы і аддзяленьні тэхнікумаў для падрыхтоўкі тэхнікаў для прамысловасьці БССР: у Барысаве запалкавы тэхнікум з мэханічным і хэмічным аддзяленьнямі на 210 чал. з тэрмінам навучаньня—4 гады, у Воршы—тэкстыльны тэхнікум з ільнапрадзільным, тэкстыльным і галянтарэйна-трыкатажным аддзяленьнямі на 130 чал. з навучаньнем у 4 гады, у Магілёве—будаўнічы тэхнікум на 440 чал. з навучаньнем у 4 гады, саматужны тэхнікум з аддзяленьнямі: мастацкай апрацоўкі дзерава, ткацка-вязальна-вышывальным, ганчарна-керамічным і па апрацоўцы мэталяў на 520 чал. з навучаньнем у 4 гады і вячэрняе аддзяленьне пры саматужным тэхнікуме на 260 чал.; у Менску—вячэрняе аддзяленьне пры будаўнічым тэхнікуме на 130 чал. з навучаньнем у 4 гады, у Бабруйску—тэхнікум па апрацоўцы дзерава на 130 чал. з навучаньнем у 4 гады, у Віцебску—аддзяленьне радыё-тэхнікуму пры політэхнікуме на 260 чал. з навучаньнем у 3 гады, у Гомелі—аўтатрактарны тэхнікум з аддзяленьнем па сельскагаспадарчых машынах на 390 чал. з навучаньнем у 4 гады і вячэрняе аддзяленьне пры аўтатрактарным тэхнікуме на 260 чал

СНК прызнаў неабходным, каб адзін з адчыняемых у СССР швэйных тэхнікумаў быў адчынены ў БССР.

Трэба адмовіцца ад унівэрсалізму ў падрыхтоўцы спэцыялістаў-эканамістаў для прамысловасьці.

Хутка растучая беларуская прамысловасьць адчувае патрэбу ў значных кадрах вучоных эканамістах арганізатарах. Пры сучаснай сыстэме суровай плянавасьці ў працы ўсёй нашай прамысловасьці эканамісты, пленавікі, рацыяналізатары, ТНБісты, працаўнікі па НАП'у калькулятары крайне неабходны. На шлях падрыхтоўкі эканамістаў для прамысловасьці існуе факультэт права і гаспадаркі БДУ. Гэты факультэт у складзе свайго эканамічнага аддзяленьня мае прамысловы, фінансавы і статыстычны цыклі. Першыя два гады чытаюцца для ўсіх цыкляў агульныя дысцыпліны і толькі з трэцяга году пачынаецца спэцыялізацыя.

Каго-ж мае на ўвазе рыхтаваць прамысловы цыкль? Ён у сучаны момант рыхтуе ўнівэрсаліста па ўсіх галінах прамысловасьці. Але такая пастаноўка пытаньня выпускаць унівэрсальнага спэцыяліста ці прыносіць карысьць прамысловасьці і ці атрымоўвае прамысловасьць добрага знатока тэй працы, за якую бярэцца скончыўшы гэты прамысловы цыкль?

Можна з упэўненасьцю сказаць, што не, і вось па якіх меркаваньнях: зараз ня знойдзецца ніводнага чалавека, які ня толькі ня скажа, што ён зьяўляецца спэцыялістам па ўсіх галінах прамысловасьці, але нават ня скажа, што ён зьяўляецца сур'ёзным спэцыялістам дасканала ведаючым усе галіны працы аднэй якой небудзь прамысловасьці. Няма ніводнага добрага спэцыяліста, які-б да тонкасьці ведаў вытворчасьці: скураную, шкляную, керамічную, тэкстыльную, дрэваапрацоўчую і г. д.

Работа нават аднэй галіны прамысловасьці зараз шматгранна і працаўнікі ў трэстах паступова дыфэрынцыруюцца па асобных галінах работы, вывучаюць яе дасканала і толькі ў аднэй галіне работы яны робяцца спэцыялістамі.

Што-ж атрымоўваецца ад унівэрсальнага спэцыяліста, калі яго вучылі шмат чаму, але ні чаму дасканала?

Атрымоўваецца тое, што чалавек добра не падрыхтован пасьля вышэйшай школы для выканаьня тэй работы, якую яму трэба даручаць. Трэба, каб сама справа вучыла яго быць спэцыялістам.

Такое становішча ў корані няправільна. Трэба, каб асобы, якія аканчваюць прамысловы цыкль, ведалі дасканальна тую работу, да выкананьня якой яны прыступаюць. Таму пры унівэрсытэцепавінен быць самастойны калі не факультэт, дык прамысловы аддзел. Гэты прамысловы аддзел павінен разьвівацца на самастойныя ўхілы па асноўных галінах прамысловасьці, прычым першыя два гады навучаньне могуць быць агульнымі для ўсіх ухілаў, а трэці і чацьверты курсы даюць тую або іншую спэцыялізацыю.

Для абслугоўваньня патрэб беларускай прамысловасьці карысна была-б мець такія ўхілы: 1) лясной, дрэваапрацоўваючай, запалковай і папяровай прамысловасьці, 2) тэксцільнай і швэйнай, 3) харчавой, 4) шкляной і керамічнай. Рашаючае слова ў гэтым за ВСНГ. Усе прадметы апошніх двух курсаў павінны чытацца толькі пад кутом погляду дэталёвага вывучэньня данай прамысловасьці, бо кожная галіна апошняй мае свае характэрныя асаблівасьці. Пры такой пастаноўцы справы унівэрсытэт будзе выпускаць, ведаючых працаўнікоў, карысных для прамысловасьці. Апрача таго, такія спэцыялісты, ведаючыя сваю справу, папаўшы на вытворчасьць, як сьвежыя людзі адразу заўважаць тыя недахопы, якіх часта не прыкмечаюць даўно працуючыя тут працаўнікі ў сілу прывычкі да тых або іншых мэтадаў ці ўмоў работы. У напрамку рацыяналізацыі вытворчасьці такія спэцыялісты будуць, бязумоўна, даваць большую карысьць.

Пажадана, каб ВСНГ і асобныя трэсты ўплатную падышлі да справы падрыхтоўкі для сябе патрэбных спэцыялістаў. Трэба сіламі прамысловасьці добра ўкамплектаваць пры унівэрсытэце неабходныя габінэты ўзорамі вытворчасьці, мадэлямі і схэмамі апошняй, даць сродкі на ўкамплектаваньне пры ўхілах спэцыяльных бібліятэк з кніжкамі і часопісамі данай вытворчасьці даць для чытаньня лекцый, вядзеньня сэмінарыяў і практычных заняткаў сваіх лепшых спэцыялістаў.

Прамысловасьць павінна сама паклапаціцца аб сур'ёзнай пастаноўцы вучэбнай практыкі для студэнтаў на прадпрыёмствах, уводзячы, дзе гэта будзе магчыма, бесперапынную вытворчую практыку.

На шлях рэарганізацыі прамысловага цыклю трэба ўстаць зараз, каб не загінуў вучэбны год. Без дапамогі з боку ВСНГ і адпаведных трэстаў унівэрсытэту цяжка будзе справіцца на першых парах з гэтай задачай.

Прафэсар Н. Серада.

Вывядзеньне новых сартоў збожжавых культур.

Загадчык аддзелу гэнэтыкі, сэлекцыі і насеннаводзтва расьліннаводнай станцыі НД Інстытуту Сельскай і Лясной Гаспадаркі імя Леніна т. Рэго паведаміў нашаму супрацоўніку наступнае аб вывядзеньні пшаніца жытняга гыбрыда.

Вопыты над скрыжаваньнем пшаніцы з жытам доўгі час не давалі належных вынікаў. Справа ў тым, што, паперша, пры апылкаваньні пшаніцы жытам процант плодазавязаўных зярнят надта нізкі, падругое, вырашчаныя з гэтых зярнят расьліны зьяўляюцца бясплоднымі. Каб атрымаць зярняты трэба штучна апылкоўваць гэты гыброд бацькоўскай формаю: жытам ці пшаніцай. Нашаму вучонаму, праф. Мэйстэру, дзякуючы асаблівым прыродным умовам паўднёва-ўсходняй часткі эўрапэйскай СССР, дзе магчыма натуральнае скрыжаваньне паміж пшаніцаю і жытам—удалося, паперша, пасунуць тэарэтычную распрацоўку між радавой гыбрыдызацыі, падругое, атрымаць сем'і пшанічнага тыпу пшаніца-жытніх гыбрыдаў, якія па зіма-устойлівасьці стаяць вышэй стандартных сартоў пшаніц паўднёва-ўсходняй Эўропы.

Праца з пшаніца-жытнім гыбрыдам распачата яшчэ ў 1918 г. у шырокім маштабе ў Саратаве

Селета гэты гыбрыд быў размножаны. праўда у невялікай колькасьці, у Лошыцы (Беларускае аддзяленьне ўсесаюзнага інстытуту па прыкладной батаніцы і новых культур).

Пакуль што гэты гыбрыд не зьяўляецца яшчэ канчаткова выведзеным у сэлекцыйным сэнсе і патрабуецца яшчэ яго далейшая апрацоўка.

Для вырашэньня прыгоднасьці для глеба-кліматычных умоў нашай краіны пшаніца-жытні гыбрыд быў уключаны ў сорта-сець БССР для спрабаваньня на нашых раённых дасьледчых станцыях.

Вырашэньне пытаньня міжрадавай і міжвідавай гыбрыдызацыі наогул мае вялікае як тэарэтычнае, так і практычнае значэньне. Гэтым пытаньнем зараз заняты цэлы шэраг навукова-дасьледчых устаноў Савецкага Саюзу.

Акрамя пытаньня міжвідавой гыбрыдызацыі, сэлекцыйныя ўстановы, у прыватнасьці аддзел сэлекцыі, гэнэтыкі і насеннаводзтве Менскай Расьліннаводнай станцыі, надае вялікае значэньне мэтаду камбінаваньня гаспадарча-каштоўных адзнак, шляхам скрыжаваньня пры вывядзеньні новых сартоў асноўных с.-г. культур, якія-б адпавядалі нашым глеба-кліматычным умовам. Зараз ужо распачаты працы па вывядзеньню новых сартоў пшаніцы як азімай, так і ярушкі, ячменю, лубіну, бікі і пялюшкі.

Для цэлага шэрагу культур ставіцца задача ня толькі атрымаць высока-ўраджайлівыя сарты з добрай таварнай якасьцю прадуктаў, але і атрымаць скарасьпелыя сарты. Так, напрыклад, нам вельмі важна вывесьці скарасьпелы сорт лубіну, бо пры нашых кліматычных умовах у паўночных і нават сярэдніх акругах БССР лубін часта ня можа высьпець.

Да ўсесаюзнага агляду ячэек МОПР'у.

Ажывіць працу нізавых ячэек МОПР'у.

Пачаўся ўсесаюзны агляд працы ячэек МОПР'у, які працягнецца на лістапад і сьнежань месяцы.

Мэты і задачы, якія высоўваюцца аглядам; у асноўным агляд зводзіцца к наступным задачам:

Накіраваць увагу партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый і ўсёй савецкай грамадзкасьці на пытаньні аб МОПР'у і на пастаноўку рэгулярнай і сыстэматычнай работы па інтэрнацыянальнаму выхаваньню працоўных мас гораду і вёскі. Выяўленьне сапраўднага стану работы нізавых ячэек МОПР'у як у горадзе, так і на вёсцы і якаснага палепшаньня іх работы, забясьпечыўшы ў іх належнае парткіраўніцтва.

Наша нізавая ячэйка МОПР'у, як у горадзе, так і на вёсцы ў большасьці праводзіць работу толькі ў часе кампаніі. Сыстэматычнай работы нізавая ячэйка МОПР'у амаль што не вядзе.

Мы павінны дабіцца якаснага палепшаньня работы нізавой мопраўскай ячэйкі, памятаючы, што ад працы нізавых ячэек залежыць праца ўсёй арганізацыі.

Трэба ўзьняць работу нізавых ячэек, раскіданых па ўсіх гарадох і мястэчках БССР, па больш высокую ступень, з тым, каб гэтым самым замацаваць інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных мас гораду і вёскі.

У шчыльнай сувязі з гэтай задачай—узмацненьне работы нізавой ячэйкі МОПР'у. Нам трэба ўзьняць увагу ўсёй савецкай грамадзкасьці на пытаньнях работы МОПР'у. Мы дагэтуль чуем на ўсіх пленумах, канфэрэнцыях, нарадах сходах аб тым, што ў некаторых мясцох фабкомы і мясцкомы не сазьвейнічаюць рабоце МОПР'у. Тое самае наглядаецца з боку некаторых парт'ячэек і райкомаў партыі і асобных камуністаў. Трэба адзначыць, што ў гэтым вінаваты ў першую чаргу нашы мопраўскія арганізацыі, якія дагэтуль нічога не рабілі ў праверцы выкананьня дадзеных ЦСПСБ дырэктыў аб сазьвейнічаньні ў працы МОПР'у.

Трэба памятаць, што справа МОПР'у, гэта агульная наша справа, у якой мы павінны быць зацікаўлены ўсе аднолькава.

М. Калмык.

Агляд ажывіў працу.

(Ф-ка Меншвэю „Кастрычнік").

Усесаюзны агляд працы МОПР'у значна ажывіў працу нашай Мопраўскай ячэйкі. Лік сяброў ячэйкі ў апошні час павялічыўся да 600.

Пасьпяхова распаўсюджваецца Мопраўская літаратура. Ячэйка МОПР'у пашырыла сярод рабочых каля 1000 экз. мопраўскіх кніг. Апроч гэтага ячэйкай МОПР'у праведзены збор мяшкоў і рагожаў для хлебазагатовак. Сабрана звыш 300 мяшкоў. Збор працягваецца.

Для правядзеньня агляду вылучана спэцыяльная камісія.

Агляд праводзіцца пад лёзунгам 100 проц. удзячненьня рабочых у шэрагі МОПР'у.

Моправец.

Гутаркі ў часе абедзеннага перапынку.

Ячэйка Мопр'у Унівэрсытэцкага гарадка (Менск) арганізавала масавы збор мяшкоў на пабудовах і выявіла 600 мяшкоў. Аднак адміністрацыя адмаўляецца выдаць мяшкі у сувязі з аглядам ячэйкаю Мопр. на пабудовах праводзацца гутаркі з рабочымі у часы абедзенных перапынкаў. Ячэйка зараз праводзіць масавую вярбоўку новых членаў. Пасьпяхова распаўсюджваецца мопраўская літаратура.

* * *

Ячэйка рабфаку БДУ лічыцца аднэй з лепшых ячэек Мопр'у ў Менску.

Нядаўна рабфакаўцы накіравалі ў падшэфныя вёскі Самахвалавіцкага р. брыгаду мопр'аўцаў, у ліку 15 чалавек, для праверкі працы вясковых ячэек. У выніку: 150 сялян уступілі ў Мопр і арганізаваны новыя ячэйкі.

Студэнты мопраўцы БДУ арганізоўваюць 2 брыгады, якія выяжджаюць у Койданаўскі і Пухавіцкі райёны для вярбоўкі сялян у Мопр і арганізацыі вясковых ячэек.

Працівагаз.

Уносім і выклікаем.

Агульны сход калектыву рэдакцыі і канторы газэты „Савецкая Беларусь" пастанавіў адлічыць у карысьць палітзьняволеных капіталістычных краін два проценты месячнай зарплаты і выклікае рэдакцыі: „Беларускую Вёску" „Акцябр" і „Чырвоную Зьмену" пасьледаваць нашаму прыкладу.

Выезд ударнай брыгады ў г. Барысаў.

Менскі акругком МОПР'у выдзеліў ударную брыгаду з актыву МОПР'у ў колькасьці 15 чалавек, якія ў бліжэйшы час выяжджаюць у г. Барысаў для дапамогі ў правядзеньні агляду працы мопраўскіх ячэек.

Брыгада прабудзе ў Барысаве два дні і арганізуе на фабрыках і заводах лятучыя мітынгі на пытаньнях працы і значэньня МОПР'у.

Таксама будзе праведзены масавы сход Мопраўцаў г. Барысаву, дзе з дакладам выступіць старшыня ЦК МОПР'у Беларусі т. Калмык.

Сумесна з ударнай брыгадай будзе праведзена пашыранае пасяджэньне Барысаўскага камітэту МОПР'у.

НАВІНЫ МОПР'у

Як прайшоў збор мяшкоў.

Мопраўцы г. Менску сабралі звыш 1000 мяшкоў і рагож, што дало 230 рублёў на карысьць палітвязьням. Па збору мяшкоў у акругах на першым месцы ідзе —Бабруйская.

Мопр'аўская канфэрэнцыя дзяцей у Менску.

Акрэавет Мопр'у разам з Акруговым бюро юных піанэраў склікае ў хуткім часе ў Менску агульна-гарадзкую канфэрэнцыю дзяцей, дзе будзе пастаўлен даклад на тэму: „Клясавая барацьба і корні фашызму" і абгаворана пытаньне аб працы Мопр'у сярод дзяцей. Канфэрэнцыя разьлічана на 500 дэлегатаў.

Дэлегацыя ад БССР на ўсесаюзную агітпропнараду МОПР'у.

На усесаюзную агітпропнараду Мопр'у, якая склікана на 1-ае сьнежня ад Беларусі выяжджаюць старшыня ЦК Мопр'у БССР т. Калмык і ад Менскай арганізацыі Мопр'у т. Цудзін.

ХРОНІКА

Да пленуму бюджэтнай камісіі.

У зьвязку з адсутнічаньнем т. Калініна, які знаходзіцца на пленуме ЦКК УсеКП(б), Прэзыдыум ЦВК БССР даручыў старшынства на пленуме бюджэтнай камісіі ЦВК БССР члену прэзыдыуму бюджэтнай камісіі т. Платуну.

Усебеларускі зьезд прафсаюзаў.

У пачатку 1930 г. склікаецца усебеларускі зьезд прафсаюзаў. Зьездам будуць вырашаны наступныя пытаньні: чарговыя задачы прафсаюзаў у рэконструкцыйны пэрыяд, справаздача ЦСПСБ і рэвкамісіі, аб 5-ці гадовым пляне разьвіцьця Народнае гаспадаркі і культурнага будаўніцтва, даклад НКпрацы аб ходзе сац. спаборніцтва і інш.

У працы зьезду прымуць удзел 266 дэлегатаў.

Вынікі абсьледваньня бюджэтаў рабочых.

Праверка бюджэтаў рабочых паказвае, што ў апошні год значна ўзрасьлі выдаткі на культ-асьветныя і грамадзка-палічныя патрэбы. Рабочыя большасьці пакупак робяць у каапэрацыйных крамах.

У бягучым годзе КСУ правядзе па Беларусі выбарачнае абсьледваньне 65 рабочых бюджэтаў.

Дапамога батрацтву на зімовы пэрыяд.

У зімовы пэрыяд у БССР будуць ахоплены дапамогай на беспрацоўю 1600 батракоў і пастухоў. Каля 600 батракоў будуць арганізаваны інспэкцыяй працы ў арцелі па лесараспрацоўках.

Акруговая інспэкцыя аховы здароўя адпушчае 3000 рублёў на лячэньне для хворых батракоў і пастухоў.

Вывучэньне калгаснага руху краязнаўчымі арганізацыямі.

ЦБ Краязнаўства разаслала на месцы дырэктыву, паводле якой у асноўку краязнаўчай працы ставіцца вывучэньне калгаснага руху і прамысловасьці. Мясцовыя краязнаўчыя арганізацыі павінны дасьледаваць і апісаць як паасобныя тыпы калгасаў, так і правоазіць дасьледаваньне і апісаньне калгаснага руху райёну ў залежнасьці ад прырода-геаграфічных і эканамічных умоў мясцовасьці.

Рост дапамогі застрахаваным.

Прэзыдыум ЦСПСБ заслухаў даклад НК Аховы Здароўя аб дапамозе застрахаваным рабочым:

— У бягучым годзе значна павялічваюцца мэдпункты першай дапамогі на прадпрыемствах.

Рост бюджэту мэдфонду накіроан галоўным чынам на абслугоўваньне рабочых на прадпрыемствы, а таксама батракой і пастухоў. У Менску будзе пабудавана памяшканьне для нэўра-псыхатрычнага дыспансэру.

Падрыхтоўка да сельскага будаўніцтва.

На калегіі Наркамзему ставіўся даклад Белсельбуду аб ходзе яго арганізацыі і аб падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону.

Калегія Наркамзему постанавіла прасіць СНК паскорыць афармленьне Белсельбуду пры НКЗ.

Пастаноўлена прасіць ЦП саюзу будаўнікоў дапамагчы ў справе ўкамплектаваньня штатаў інжынэра-тэхнічнага пэрсаналу. З другога боку, Белсельбуд павінен сам паклапаціцца аб падрыхтоўцы дзесятнікаў.

На патрэбныя зваротныя сродкі Белсельбуду пастаноўлена вызначыць 750000 рублёў.

Будуем новыя клюбы.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў у бягучым годзе пачаць пабудоўку клюбу на ф-ках „Днепр" і „Х Кастрычнік". Акрамя таго будуць пабудаваны новыя клюбы для рабочых будаўнікоў у Менску і краўцоў у Віцебску.

Мэдычныя курсы.

Мэдычнае т-ва аргавізоўвае у Менску курсы мэдычных ведаў для рабочых.

Гэткія-ж курсы будуць арганізаваны, згодна рашэньня прэзыдыуму ЦСПСБ у акруговых гарадох.

Курсы лабарантаў і бактэрыолёгаў.

Прэзыдыум ЦП саюзу мэдсанпрацы пастанавіў у бліжэйшы час арганізаваць курсы па падрыхтоўцы новых кадраў лабарантаў і бактэрыолёгаў.

Прафкурсы батрацкага актыву.

На арганізацыю прафкурсаў для батрацкага актыву прадугледжана 13.500 р. Акрамя таго на арганізацыю аўтакультперасоўкі адпушчана 1.500 рублёў.

Праверка інтэрнацыянальнага выхаваньня.

Прэзыдыум ЦП саюзу будаўнікоў пастанавіў пачаць праверку працы па інтэрнацыянальнаму выхаваньню свайго саюзу. Да першага сьнежня мяркуецца правесьці праверку ў Менскай, Бабруйскай і Мазырскай акругах.

Палепшым культ-вых. будаўнікоў.

ЦП саюзу будаўнікоў ухваліў адпусьціць 500 руб. на правядзеньне культурна выхаваўчай працы сярод рабочых унівэрсытэцкага гарадка.

1000 руб. на абсталяваньне чырвонага кутка.

ЦП саюзу будаўнікоў на рамонт і абсталяваньне чырвонага кутка трэцяга групкому СБ адпусьціла тысячу рублёў.

Рабселькоры нам пішуць.

Разаб'ём пляны кулацтва!

Пяць вёсак Бельскага і Ускоскага сельсавету, Ляднянскага райёну на плошчы 1240 гэкт. аб'яднаюцца ў сельска-гаспадарчую камуну. А кулакі з вёскі Хаўбоі ўсякімі спосабамі імкнуцца пралезьці ў камуну, каб потым яе зруйнаваць, але гэтага ім ня ўдасца.

Я. Кручкоў.

Спадчына мінулага.

У камуне „Авангард" Калініскага раёну на сродкі дзяржавы і камуны арганізаваны дзіцячыя яслі.

Але выхаваньне ў гэтай камуне вядзецца, як у сярэднявякоўі. Калі якоенебудзь дзіця правінаваціцца, дык яго ставяць у „угол", пры гэтым пужаюць яго (ма'быць дзеля прыкладу астатнім) голасам льва, або іншага дзікага зьвера.

Не захоўваецца ў ясьлях і гігіена. Ня гледзячы на тое, што Даманавіцкі мэдпункт знаходзіцца ад камуны за кілёмэтр, загадчык гэтага мэдпункту гр-н Фрыд заглядвае ў ясьлі вельмі рэдка.

Я. М. Акуліч.

„Бяспрытульны" завод.

У Гарадзішчы, Шклоўскага райёну, Магілёўскае акругі будуецца маслаапрацоўчы завод, на пабудову якога адпушчана 14000 руб. За пабудоваю гэтага заводу ніхто не наглядае. Падрадчык Шабанаў вядзе самастойна працу пабудовы. Ён „пабудаваў" падмур, які праз некалькі дзён скрывіўся. Прышлося руйнаваць і будаваць ізноў. На пабудове пануе п'янства і безгаспадарчасьць і нікога гэта не датычыцца.

Л-ны.

Папраўкі.

Ва ўчарайшым нумары нашай газэты на 3-й старонцы па недагляду выпускаючага і карэктароў здарылася памылка. У часе вёрсткі канец артыкулу „ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ" за подпісам УЛ. БУСЛАЎ заверстаны ў другой палове артыкулу „НА НОВЫХ РЭЙКАХ", а канец гэтага артыкулу („На новых рэйках") за подпісам ЭПШТЭЙН заверстаны ў канцы артыкулу „ПЕРШЫЯ ВЫНІКІ".

Гэтыя артыкулы павінны быць у такім выглядзе:

„НА НОВЫХ РЭЙКАХ" ёсьць артыкул т. ЭПШТЭЙНА і чытаецца ў пачатку пяць абзацаў з таблічаю і першы радок 6-га абзацу, які пачынаецца словамі „РЭАРГАНІЗАЦЫЯ ДАЛА МАГЧЫМАСЬЦЬ"... Далей ідзе „ВЫРА" і канец гэтага слова „ШЫЦЬ" чытаецца ў артыкуле пад загалоўкам „Першыя вынікі" ў 11-м абзацы з другога радка да канца артыкулу.

„Першыя вынікі" бясьць артыкул тав. УЛ. БУСЛАВА і чытаюцца ўсе першыя 10 абзацаў і першы радок 11-га абзацу, які пачынаецца словамі „РЭАРГАНІЗАЦЫЯ АКРУГІ ЗНАЧНА"..." і далей словы „ПАЛЕПШЫЛА" пераносіцца і чытаецца ў артыкуле „НА НОВЫХ РЭЙКАХ" у 6-м абзацы ў другім радку.

* * *

Аўтар артыкулу „Калгаснае будаўніцтва на новым этапе" („Савецкая Беларусь" ад 12 лістапада) Г. АРЦЁМКАЎ, а не Г. Арцёмаў, як гэта памылкова было надрукавана.

ШАХМАТЫ № 38 (183).

Пад рэдакцыяй А. КАСПЭРСКАГА.

Задача № 36 М. Габрыловіча.



Бел. Крс4, Лg7, Сс1, Сg4, Кd1, Кd7.
Чорн. Крe4, Лe8, Лb3, Сb6; п.п. с7, е7, f4

Мат у 2 хады.

10-я партыя матчу на пяршынства у сьвеце.

Бел.—Багалюбаў, чорн.—Алёхін.

1. d2-d4, d7-d5. 2. с2-с4, с7-с6. 3. Кg1-f3 Кg8-f6. 4. Кb1-с3, е7-е6. 5. Сс1-g5, Кb8-d7. 6. е2-е3, Фd8-а5+. 7. Кf3-d2, Сf8-b4. 8. Фd1-с2, d5:с4. 9. Сg5:f6, Кd7:f6 10. Кd2:с4, Фа5-с7. 11. Сf1-е2, 0-0 12 0-0 Лf8-d8. 13. Ла1-d1, Кf6-d5. 14. Кс3-е4, Сb4-е7. 15. а2-а3, b7-b6. 16. Се2-d3, Сс8-b7. 17, Лd1-е1, Ла8-с8. 18. b2-b4, b7-b6. 19. Фс2-b3, Кd5 f6. 20. Лf1-d1, Кf6-d4! 21. Ке4-g3, с6-с5! 22. d4:с5, b6:с5. 23. b4-b5, Сb7-d5. 24. Фb3-с2, Кg4-е5! 25. Кс4:е5, Фс7:е5. 26. Сd3-с4, Сd5:с4! 27. Фс2:с4, Фе5-b2! 28. а3-а4, Лd8:d1+. 29. Лс1:d1, Фb2-b4. 30. Фс4-с2, с5-с4. 31. Кg3-е2, Се7-f6. 32. g2-g3, с4-с3. 33. Лd1-b1, Фb4-а4. 34. Крg1-g2, Лс8 d8. 35. Фс2-е4! Лd8-d2. 36. Фе4-с4, Лd2-с2! 37. Лb1 d1, Фа5-b6. 38. Ке2-d4, Фb6-d8. 39. Лd1-d3, Сf6:d4. 40. Лd3:d4, Фd8-f6 41. Лd4-f4, Фf6-е5. 42. е3-е4, Лс2-d2 41. Лd4-f4, Фf6-е5. 42. е3-е4, Лс2-d2 43. Фс4-с8+, Крg8-h7. 44. Лf4:f7, Фе5:е4+ 45. Крg2-h3, Лd2-d5! 46. Лf7-f4, Лd5-h5+ 47. Крh3-g4, Фе4-е2+ 48. f2-f3 Лh5-g5+ 49. Крg4-h3, Фе2-f1+ 50. Крh3-h4 ці белыя здаліся, т. я. чорныя даюць мат у 3 хады (50...Лg5 h5+. 51. Крh4:h5, Фf1-h3+ 52. Лf4-h3, g7-g6 ці Фf5×).

Адна з лепшых партый матчу.—Становішча матчу + 11 — 5 = 6 НА КАРЫСЬЦЬ АЛЁХІНА.

ПАПРАЎКА.

У задачы № 37 гл. аддзел № 37 ад 3 лістапада памылкова надрукавана чорн. Ладзя а5, трэба—белая Ла5.

СЭАНС.

У мясцкоме саюзу хімікаў 20 кастрычніка І. Мазэль згуляў адначасова 23 партыі ў шахматы 10 парт. усе выйграў, у шашкі 13 партый + 9 —1 =3.

МАТЧ.

Іграюць матч да шасьці выйграных партый І. Мазэль і Кейлес; першыя дзьве партыі выйграў Мазэль

Што слухаць па радыё

СУБОТА, 16 ЛІСТАПАДА.

17-00—Пасьляабедзенны канцэрт.
17-30—Час абароны краіны і Чырвонай арміі; політ. забесьпячэньне ў час паветрана-хэмічнага нападу—т. Сарабраны.
18-00—Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё.
19-00—Беларуская радыё-газэта (з яўрэйскім аддз.).
20-00—Праверка часу.
20-00—Сялянская вячорка.
21-00—Канцэрт.

НЯДЗЕЛЯ, 17 ЛІСТАПАДА.

9-00—Шахматы і шашкі.
9-30—Сялянскі бязбожнік-ранішнік.
10-40—Палітычны і эканамічны агляд за тыдзень.
11-20—Сьпявайце разам з намі.
12-00—Агляд сёньнешніх цэнтральных і мясцовых газэт.
17-00—Літаратурны тыдзень.
18-00—Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё.
19-00—Гадзіна актывісткі, работніцы і сялянкі.
19-40—„Чырвоная Зьмена".
20-30—Канцэрт.
23-00—Інфармацыя.

ПАНЯДЗЕЛАК, 18 ЛІСТАПАДА.

17-00—Сялянская радыё-газэта (з польск. аддз.).
18-00—Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё.
19-00—Беларуская радыё-газэта (з яўр. аддз.).
20-00—Праверка часу.
20-00—Гадзіна калектывіста.
20-30—Гутарка на нац. мове.
21-00—Канцэрт опэрнай музыкі.
23-00—Вывучэньне нямецкай мовы.

АЎТОРАК, 19 ЛІСТАПАДА

17-00—Час піонэра і вучня.
17-30—Палітычныя перадачы.
18-00—Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё.
19-00—Беларуская радыё-газэта (з яўрэйск. аддз.).
20-00—Праверка часу.
20-00—Радыё-аматар.
20-30—Сялянская вячорка.
21-30—Трансьляцыя савецкіх і замежных станцый.

СЕРАДА 20-ГА ЛІСТАПАДА.

17-00—Сялянская радыё-газэта (з яўрэйск аддз.).
18-00—Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё.
19-00—Беларуская радыё-газэта (з польск. аддз.).
20-00—Праверка часу.
20-00—Беларускі Батрак.
21-30—Камсамольскія перадачы.
21-00—Навуковая